Віктар Казько



...гатоўнасьць ахвяраваць і плакаць, гатоўнасьць да пракаветнага пакутніцтва трымае нас у тонусе, падтрымлівае адчуваньне, што мы яшчэ жывыя...

# Зазірнуць у вочы свайму «Я»

З чаго хацелася б пачаць? З горычы. З адчуваньня апошнім часам няўтульнасьці жыцьця. Няёмкасьці перад ім і нават перад самім сабой за тое, што ты яшчэ жывы, век твой яшчэ ня скончыўся, а ты нібыта сыйшоў з яго, выпаў, згубіўся, зьнік. Цябе няма і як увогуле не было на гэтай зямлі.

Ты прыйшоў на яе немаведама адкуль. Здарожыўся. Прысеў у цяньку абоч шляху пераабуцца, праветрыць, прасушыць навярэджаныя ногі. І як упершыню ўбачыў іх: якія ж яны белазношаныя ўжо. Але веры таму, што гэта ты іх знасіў, няма, як і няма даверу і да самога сябе, бо ты са сваімі нагамі так не абышоўся б. Чужыя яны, чужыя. І ты чужы гэтай ранішняй прахалодзе. Яна толькі на гэта імгненьне лагодзіць і песьціць цябе, таму што ты нечакана апынуўся на яе шляху. Яна ж прыйшла з вечнасьці і імкнецца туды ж, а ты толькі нейкая недарэчнасьць на яе шляху. І яна лічыць за лепшае абыякава і невідушча, як страчаны і адпалы ўжо ад дрэва ліст, аб-

мінаючы цябе, прылашчыць, каб ты не ўтварыў нейкай тут шкоды.

Вось да чаго ты чужы зямлі, якую памылкова лічыш роднай. Аб цябе ўжо нават і не спатыкаюцца. Ты сухі адмерлы ліст, вымецены з часу і памяці навакольля. Тваё вока даўно ўжо невідушчае. Ты даўно ўжо глухі на кожнае сваё вуха, таму што немаведама калі аглух і асьлеп ня толькі на вушы і вочы. Ты страціў, згубіў слых і зрок на трэцяе сваё вуха і на трэцяе вока. У тваёй памяці няма гуку, няма малюнку явы, бо седзячы ў ценьку, паддаўся падману прахалоды і замест таго, каб хуценька пераабуцца, падхапіцца і зноў рушыць у дарогу, ты пачаў сузіраць свае ногі, – як сараканожка, у каторай нечакана выявіўся, прачнуўся розум. Розум асобы, стварэньня, якое ў свой час нарадзілася, адбылося на зямлі, але нечакана, не пакідаючы яе, уявіла сабе, што трапіла ў іншае жыцьцё, іншы сьвет. Выпала з жыцьця людзей і не прыбілася да якога-небудзь іншага жыцьця. Таму недарэчна і бязглузда і паводзіць сябе, накшталт героя адной з фантасмагарычных аповесьцяў братоў Стругацкіх, якімі мы зачытваліся ў юнацтве.

Чалавек, а хутчэй ужо і не чалавек, жыхар крамлёўскіх нябёсаў і зямлі, рыхцікі з М. С. Хрушчова, рашыў пайсьці пагуляць, проста так, разьмяццца, а заадно ўжо, каб ня бавіць марна часу, наблізіцца і сустрэцца з народам. Але як заведзена, ніякага народу ні ў Крамлі, ні паблізу яго не назіраецца. І тады ён садзіцца ў машыну. Едзе да любага яму народу ў легкавіку. І ўжо, здаецца, бачыць той народ: добра пакусанага часам старога са старой і зьведзенай на воўну і малако сівай казой на поплаве каля пахіленай сіроцкай хаты. Пасьвяць старыя, як бы тагасьветныя ўжо, казу і нібыта некага чакаюць – часта і пільна пазіраюць на дарогу. І жыхар крамлёўскіх нябёсаў ужо крыху ў сумненьні – сон гэта ці ява – імкне да іх. Але ні на крок не набліжаецца. І крамлёвец ужо і сам ня ведае, на якім ён сьвеце, ці яго гэта ўвогуле зямля, ці яго народ.

І жахліва, страшна яму робіцца, бо жыхар ён хоць і нябёс, але адначасова і землянін. І народ яго зямны. Ён не дазволіць, каб нехта так гуляўся з ім, пазбаўляў народу і зямлі. Ён ужо ўпэўнены, што яго дураць: той жа шафёр дурыць. Паставіў машыну на калодкі і газуе. Але ён і сам на дурыкі здатны: непрыкметна прыадчыняе дзьверцы легкавіка і...

Пра далейшае можна і не гаварыць.

Ці ня знакавая, лёсавая нам зьява. Штосьці накшталт гэтага адбылося і адбываецца з намі на працягу ўсяго нашага жыцьця. Мо таму адтуль і нашае закарэлае адчуваньне вінаватасьці перад тым, што ня спраўдзілася, чаго не адбылося і цяпер, пэўна, ужо і не адбудзецца. Перад сваёй так і не адбудаванай у стагоддзях хатай, якая ў нашым прыгожым пісьменстве амаль заўсёды чужая; дзецьмі, якія таксама чужыя – заўчасна цураюцца хаты, бацькоў, роднай зямлі і нават белага сьвету і знаходзяць сябе добра адбегшыся ад бацькаўшчыны. І колькі, колькі такіх. Я гавару пра гэта таму, што сам з іх. Быў у ліку іх да пэўнага часу. Добра зьведаў, як цяжка прарастаць на чужыне, прырастаць да чужога скурай. А правільней – жыць, ня маючы скуры, аголеным целам. Тут пазногаць саб'еш, палец угразіш – дых перахопвае і сьлёзы ўваччу, і гэта на роднай зямлі, пад роднымі шкадавальна-спавівальмі аблокамі. А ў чужым краі ўсё тваё цела ў сукравіцы збалелага.

Ніхто і нішто так не хварэе і не баліць, як памяць айчыны, бо ты яе

хаваеш перш ад самога сябе, а потым і ад усіх і кожнага. Хаця гэтым усім і кожнаму напляваць на цябе, твой боль і тваю памяць. Мо якраз дзякуючы гэтай памяці і гэтаму болю столькі славутых знакамітых імёнаў праз чужыну і стала вядома сьвету? Дзякуючы болю і памяці, а яшчэ і крыўдзе, якую, па словах нашага прарока, мы на нагах сваіх, на руках і на плячах са стогнам і плачам разносім па сьвеце.

Бо на бацькаўшчыне жыць абражліва і зьневажальна. Так заўсёды было, такая ў нас завядзёнка. Хаця... Няма правілаў без выключэньняў, а закону – бяз дробненькіх, сьляпымі літарамі, каментарыяў. Толькі да тых выключэньняў мы як народ ня маем ніякіх адносінаў. Усе яны насуперак нам. Насуперак нам Кірыла Тураўскі і Францішак Скарына, Тадэвуш Касьцюшка і Кастусь Каліноўскі... Не, ён ужо не насуперак. Гэта ўжо амаль што наш час, наш лёс, наша, здаецца, не такая ўжо і далёкая будучыня. Бо сёньня ўсе мы, беларусы, і, канечне, перш наперш тыя, хто хоць крышачку насуперак, стаім пастроеныя па камандзе сьмірна перад шыбеніцай. І кат ужо намыльвае вяроўку, каб ня мулка было завіснуць у пятэльцы на стагоддзі.

Гаворачы гэта, я нічога ня зводжу да якой бы там ні было ўладнай ці асобавай канкрэтыкі, з другога боку, не адмаўляю іх узьдзеяньня на паскарэньне набліжэньня да калектыўнай шыбеніцы. Бо, на маю думку, гэта ня мае ніякага асаблівага сэнсу. Як ня мае сёньня сэнсу крывавы вопыт нашых бацькоў, продкаў. Увогуле іх у нас як не было і няма. Паглядзіце, азірніцеся і скажыце, дзе, апроч вясковых занядбаных могілак, хоць знак які ад іх, дзе наша старажытнасьць. Тыя ж нябожчыкі нашыя, бабулі ды дзядулі, прашчуры. А па Беларусі, як сьведчыць наш жа зямляк, генетык з сусьветным імем, дарэчы, невядомым на айчыне, прайшло ня меней дзьвюх сотняў пакаленьняў нашых прашчураў. Гэта ня меней, як трычатыры тысячы гадоў. Ня кожны народ можа пахваліцца такой трывалай аседласьцю, схільнасьцю менавіта да сваёй зямлі.

Дзе ж сьляды гэтых пакаленьняў, якім ветрам іх занесла, якой завеяй замяло, якой травой забыцьця яны зарасьлі, якія дрыгва і багна іх паглынулі? Лясы, воды, балоты ды тарфянікі. То-та ж мы так кінуліся зводзіць і нішчыць іх. Хутчэй, хутчэй праглынуць іх, улагодзіць сваё ненажэрнае чэрава і некага там, на Месяцы ўлагодзіць – паслаць яму пасьцельку з нашых тарфянікаў, прасьпяваць калыханку з пошуму нашых дуброў, умыць гаючай вадой нашых крыніц. І скласьці хвалебную песьнюмалітву забойцам і зьнішчальнікам спрадвечнай сваёй зямлі, калыскі-маці.

Няма ў нас сёньня і знаку глыбокай даўніны. Але і больш блізкай няма. Бліскучае сьведчаньне гэтаму – занядбаньне Турава-Пінскага княства. У другіх мясьцінах ад падобных яму княстваў пайшлі народы і землі; тая ж хаця б Кіеўская Русь – Украіна, Масковія – Расія. А што пайшло ад нашага тутэйшага княства – тубыльцы-палешукі ды на тысячагоддзе Турава нейкая падобная на дзяржаўную шыбеніцу камяніца з чырвонай цэглы? І ўжо сама зямля там знакава і бунтоўна прарастае каменнымі крыжамі. Крыжамі, што паўстаюць з пралітай у свой час крыві, пахаванай пад Прыпяцьцю, але нязбыўнай славы. Зямля ўжо не трывае зьдзеку часу і людзей.

Але гэта тое, што тычыцца сівой, парослай ужо міфамі і паданьнямі даўніны. А найбольшы зьдзек з нашай адносна новай гісторыі, якая калі ня ў кожнага сёньня ў памяці, дык у кожнага на слыху. Я маю на ўвазе

паўстаньне Тадэвуша Касьцюшкі і нашыя адносіны да змагара за нашую волю і долю. Нічога больш ганебнага прыдумаць тут, здаецца, немагчыма. Не само, зразумела, паўстаньне, а вынікі яго, увекавечваньне праз стагоддзі. Шукаю аналагаў у гісторыі нашых краінаў і народаў – і не знаходжу іх. Прыгадваецца толькі савецкі чорны гумар: з нагоды нястачы на шыбеніцу зьяўляцца з уласнымі вяроўкамі. І цягнуцца, цягнуцца самахоць беларусы са сваімі вяроўкамі, нават намыленымі ўжо, і дзякуюць, дзякуюць кату, рукі яму цалуюць…

Я маю на ўвазе гвалтаўніка і ката нашай свабоды Аляксандра Суворава. Я ніколькі ня супраць таго, што гэта вялікі чалавек, геніяльны палкаводзец, але хай гэтым усьцешваюцца там, дзе за ім ня цягнуцца ручаі і рэкі нашай беларускай крыві. Хай яго носяць там на руках і ўслаўляюць, мо гэта і сапраўды геніяльна: пуля – дура, штык – молодец. Але нам, нашчадкам забітых ім нашых пра- і пра- ці варта падаць ніц перад ім, разьбіваць лоб, молячыся за ўвекавечваньне забойцы і ката нашых продкаў. Ствараць яму на нашай зямлі музеі, помнікі і мемарыялы. Ці не здрыгануцца, ужо не кажу пра тых, каго паклаў ён, магілы больш сьвежыя, ахвяраў Хатыні і Зельвы, як здрыгануліся жывыя ў Эстоніі.

Ня трэба толькі думаць, што я цалкам апраўдваю эстонцаў за разбурэньне помнікаў воіну-вызваліцелю ад фашызму, знос магілаў савецкіх салдатаў. Магілы ж увогуле, чые б яны ні былі, недатыкальныя. Чалавек таму і пайшоў на той сьвет, каб яго не трывожылі больш, адпачыць. І недапушчальна, ці ня самы гэта найвялікшы грэх – парушаць яго вечны сон. І часьцей за ўсё дзеля толькі амбіцыяў, шызы недаробленых палітыкаў, каб пакрасавацца на фоне славутых нябожчыкаў і іх костак.

Увогуле, як мне здаецца, ператрус касьцей любімы занятак мінулага стагоддзя на тэрыторыі былога Савецкага Саюзу, а сёньня паўсюдна ўжо на тэрыторыі так званага СНД. Нешта накшталт нацыянальнай ідэі, знайсьці якую прагнуць, ня менш чымсьці алхімікі праглі адшукаць філасофскі камень у сярэднявеччы ці савецкай пары дзесяцікласьніцы сэнс жыцьця, усе найноўшыя пажыцьцёва, лічы, абраныя валадары часоў дэмакратыі. Дастаткова толькі ўзгадаць Троцкіх, Сталіных, Хрушчовых, а пазьней і самога Уладзіміра Ільіча Леніна.

Але гэта алімпійцы, скарапіёны ў адной шклянцы ці бляшанцы. Ім ад нараджэньня нарачона быць скарапіёнамі і шулерамі—тасаваць і гулярца жыцьцямі чалавека і яго косткамі. Сьведкам адной такой гульні яшчэ ў дзяцінстве быў і я на самым пачатку пяцідзесятых гадоў. Ваярам, што загінулі пры вызваленьні гораду Калінкавічы, было адведзена амаль райскае месца. У гарадскім, наскрозь працятым сонцам скверы, а па маім дзіцячым тады разуменьні, — парку. Нехта ня без галавы і Божай хрысьціянскай літасьці зьвёз іх туды і паклаў у брацкія магілы. У ногі ім упіралася блакітам сьцяны, пазірала ў вочы задуменным срэбрым купалоў і строгай вартасьцю крыжоў царква. У галаве — месьціўся старажытны брукаваны шлях — на поўдзень: да Прыпяці з Мазыром і далей да Кіева, Адэсы і Чорнага мора. І зноў жа, маё дзіцячае ўражаньне, неба над магіламі супакоеных на вечны адпачынак ваяроў ня ведала хмараў, было заўсёды цёплае, сухое і высокае.

Каму перашкодзіла і пачала замінаць гэтая іх высокая супакоенасьць, ня ведаю. Але брацкія безыменныя магілы у гарадскім парку і магілы, у

якіх меліся і гаспадары, з імёнамі і званьнямі, пачалі раскопваць. Раскопваць і некуды звозіць ўжо напаўсатлелыя косткі. І горад, асабліва рабочая яго ўскраіна, да якой прыналежаў і я, неяк зьнямела прысеў і прыціх. У людзях, у тых, хто толькі вярнуўся з фронту і не забыў яшчэ вайны, спакон веку жыло сьвятое, што даецца з малаком маці чалавеку: павага да незваротнаьсці, да сьмерці. Нельга непакоіць і перабіваць сон нябожчыкаў, бо ў пакараньне – некаму будзе хаваць тых, хто гэта робіць. Магіла салдата, на якім баку ён бы ні стаяў, — сьвятая. Гэта запаведана ня толькі Богам, але і Жэнеўскай канвенцыяй краінаў-пераможцаў.

Тут жа тае пары ў Калінкавічах зьдзек над памяцьцю мёртвых быў нават не двайны ці трайны — суцэльны. Па ўсім горадзе мабілізавалі і так званых залатароў. Мо нават таму, што ніхто больш за гэтую работу не наважыўся брацца. Толькі далакопы-магільшчыкі і залатары ды іх унураныя, абыякавыя да жыцьця коні з навешанымі на шыі торбамі аўсу, які яны няспынна жавалі каля патрывожаных, раскапаных і яшчэ пахкіх магілаў. Таксама няспынна жавалі, не злазячы з возу, і гаспадары гэтых коней — залатары: па тым часе то і добра харчаваліся — каўбасой і хлебам. Маўкліва харчаваліся, пэўна гэтаксама, як маўкліва, не паказваючы твару, адсякае кат галаву сваёй ахвяры. Харчаваліся, пакуль іх сьмярдзючыя ўжо да апаленьня бочкі загружаліся рэшткамі костак са сьвежараскапаных магілаў.

Тады яны варушылі, толькі варушылі лейцамі сьцёгны сваіх коней, і тыя пачыналі рушыць ўноч праз прыбіты, здаецца, назаўсёды да чорнага неба жоўклы месяц і настылыя, хаця і летнія зоркі. Сьледам за гэтымі пахавальнымі дрогамі, імкнучыся застацца ў начным цені, ішлі і мы, дзеці рабочай ускраіны станцыі Калінкавічы. Чаму, навошта і што прымушала нас гэта рабіць, я ня ведаў і ня ведаю сёньня. Мо і несправядлівасьць, вялікая несправядлівасьць тым летам да нас, дзяцей нашых бацькоў: яны білі, сьцяўшы зубы, за самую маленькую правіннасьць. Білі вяроўкамі, лейцамі, розкамі і ставілі голымі каленамі на гарох, які мы глыталі, падсольваючы сваімі сьлязьмі.

Вось такая вясёленькая прадгісторыя ці нават і сама гісторыя з нашай страчанай, а мо і знойдзенай менавіта тады нацыянальнай ідэі, пошуку і знаходжаньня — набыцьця сэнсу жыцьця. Гісторыя, прадгісторыя і нацыянальная ідэя, якая жыве і сёньня. І будзе жыць вечна, пакуль ёсьць, ня спрахлі яшчэ ў зямлі косьці Курапатаў і бязыменных ахвяраў пад Гомелем. Датуль мы іх будзем ператрушваць. І няма чаго наракаць на эстонцаў. Не яны першымі пачыналі. Яны толькі паўтараюцца.

З помнікамі, пэўна, яшчэ больш складана. Гэта толькі здаецца, што іх ставяць людзі. А на самой справе іх стварае і ці не вырошчвае час. Я маю на ўвазе ня масава-канвеерную іх вытворчасьць, накшталт пануючага сёньня мастацтва поп-арта, лізаблюдства правадырства, а гістарычную неабходнасьць іх зьяўленьня, гістарычную падзейнасьць, якая нараджае іх, адраджае, падобна Афрадыце, з марской пены, каб кан'юнктурныя прылівы і адлівы грамадскага жыцьця ня змылі, не зьлізалі патрэбных усяму чалавецтву імёнаў. І як толькі такія помнікі з дапамогай людзей падымаюцца з бездані, здаецца, самой зямлі і часу, яны ўжо не прыналежаць нікому, апроч той жа зямлі, апроч часу. І зьнішчэньне іх нішто іншае, як зьдзек і абраза памяці часу. Насьмяеньне, за якое пачынае помсьціць зямля, час і самі мёртвыя, нябожчыкі, памяць якіх людзі згвалцілі.

Бунтоўнасьць жывых у адносінах да нябожчыкаў – гэта прызнаньне сваёй бездапаможнасьці, бясьсільля і ў пэўнай ступені вялікай крыўды на сваю гісторыю. Бунтоўнасьць маленькага народу, у большасьці мо і апалітычных эстонцаў – ці не праява такой крыўды, імкненьне праз гады засьведчыць сваю нацыянальную годнасьць і вартасьць. Абуджэньне нацыянальнай памяці, у якой сотні і тысячы расстраляных гэбістамі і энкусаўцамі, эшалоны і эшалоны вывезеных імі эстонцаў у Сіблагі, Казлагі і СЛАНы. І за ўсё гэта прысьпеў час разьлічыцца. Больш таго, эстонцы патрабавалі і дамагліся таго, каб напісаньне назвы іхняй сталіцы гучала звыкла іх слыху і мове. Паўсталі з-за дзьвюх літарак. Удумацца толькі трэба! А мы...

Усё і ва ўсім робім і ідзем насуперак цьвярозаму розуму і сэнсу. Сьвет пазбаўляецца ад фашызму і гітлерызму. Мы ж сваіх Гітлераў да сёньняшняга носім на руках, ставім ім помнікі і ўзводзім мемарыялы. Накшталт мемарыялу Дзяржынскаму, аднаўленьня лініі абароны Сталіна. Той самай бязглуздай лініі, якая нікога не абараніла, бо войскі фашыстаў нават і не даведаліся, што гэта такое: абмінулі і пайшлі спачатку ў Менск, а потым і на Маскву. А мы з вар'яцкай упартасьцю крамлёўскага генія, бацькі ўсіх параноікаў і катаў, касьцьмі кладземся, каб адбудаваць гэту лінію наноў. І ня проста адбудаваць – наладзіць туды рытуальныя экскурсіі, катаньне на бронемашынах. Дазвольце спытаць: навошта, дзеля чаго? Добра, калі б проста так, з-за абдзеленасьці шэрым рэчывам у галаве. А калі зусім наадварот, з-за лішку гэтага рэчыва, зладзейскасьці і злосьці на ўсё сваё, нашае – стваральнае і мірнае. На выхаваньне новых нелюдзяў – сатаністаў, скінхэдаў. Бо тое, што сапраўды нашае, зруйнавана і занядбана, парасьлі травой забыцьця ўсе нашыя славутыя магілы. Мы нават толкам ня ведаем, чым займаўся, што рабіў Васіль Быкаў, маючы адукацыю гісторыка, ня маем уяўленьня пра тое, хто такі Францішак Скарына.

Адкуль жа гэта ваяўнічае і наступальнае невуцтва і цемрашальства? Адкуль такая агрэсія ў народу, які сам усё жыцьцё пакутаваў ад варожасьці і зьдзеку чужынцаў з сябе, сваёй Айчыны, які без перабольшваньня зьяўляецца найбольшым пакутнікам Еўропы, бо, у адрозьненьне ад іншых народаў, нам некуды было сыходзіць са сваёй зямлі. З стагоддзя ў стагоддзе адбываўся генацыд нашага народу. Нас гнюсілі, трушчылі з усіх бакоў і куткоў нашай геаграфіі і гісторыі, выразалі і ўкарочвалі на адну трацїну насельніцтва, дзьве трацїны, напалову. Які яшчэ народ здольны ажыць і апрытомнець пасьля такога, амаль лазернага скальпелю гісторыі, пасьля такога абразаньня і хрышчэньня?

Мы ажылі і выжылі, але ці апрытомнелі? Ці не адбылося пасьля такога зьдзеку з нас, нашага зьліцьця з абразальнікамі і хрысьціцелямі, парадненьня з нашымі катамі, зьліцьця і братэрства ахвяры і ката? І нам прыйшлася да спадобы нашая адвечная ахвярнасьць. І нам прыйшлося да спадобы нашае адвечнае пакутніцтва. Пакутнасьць нашага жыцьця прызвычаіла, прывучыла шукаць і знаходзіць пакуты нават там, дзе іх няма, і атрымліваць нават сваеасаблівую асалоду ў гэтым.

Гатоўнасьць ахвяраваць і плакаць, гатоўнасьць да пракаветнага пакутніцтва трымае нас у тонусе, падтрымлівае адчуваньне, што мы яшчэ жывыя.

Але што насамрэч хаваецца за ілюзорнай прывіднасьцю такога жыцьця?

У народзе існуе прыказка: чым горш – тым лепей. Гэта значыць, што мы падышлі да такой рысы, мяжы, за якімі горш ужо немагчыма. Гэта прадвесьце, амаль наканаваньне перамены да лепшага. Але як я не прыслухоўваюся да свайго горычу і болю, колькі не ўглядаюся ў іх люстэрка – люстэрка сваіх вачэй, я не адчуваю і ня бачу наперадзе аніякіх знакаў такога наканаваньня. Верх бярэ зусім іншае. Такая пакора і даравальнасьць заўсёды больш разьвітальныя. Але тут я нямею і замаўкаю, бо я таксама неаддзельны ад уласных і агульных нашых пакутаў, якія мы сёньня амаль што пестуем і лашчым, амаль што культывуем у сабе, бо, несучы паперадзе сябе свой боль, здаецца, нам больш звыкла, зручна і шмат лягчэй жыць на сьвеце...

Гэта былі амаль што мае родзічы. Яны прыехалі ў Менск і завіталі да мяне. Крыху пасядзелі і сабраліся ехаць дамоў. Але выбрацца з Менску аказалася ня так проста. То быў час, калі білеты і каўбаса былі танныя, усе некуды ехалі і за ўсім стаялі чэргі. І тут на вакзале чарга ў білетную касу была неверагодная, разьюшаная і бязьлітасна злосная.

Мая тройца, а іх якраз было трое: сьлесар, загадчык гаспадаркі ў школе і настаўнік, нармальныя, прыстойныя людзі, нават здаровыя і толькі крышку пад хмелем. Яны кінулі вока на чаргу, павярнуліся, параіліся аб нечым паміж сабой. І зноў рушылі да білетнай касы. Але цяпер адзін з іх выдаваў на сьляпога і вельмі брыдкага – з выварачанымі, як зьедзенымі трахомай векамі, другі, па-заечы зьвесіўшы рукі, пакульгваў на абедзьве нагі, трэці, не зважаючы ні на кога, нешта мекаў, гергетаў і мыкаў, як глухі і нямы.

Сьляпы вёў гэтую калечную каманду да вакенца касы, і народ, больш, пэўна, гідуючы, чымсьці спачуваючы, расступаўся. Яны без перашкодаў наблізіліся да касы. Сьляпы падаў грошы і атрымаў білеты. Яны, усё яшчэ ўбоганькія, выйшлі на прывакзальную плошчу, у такім жа стане датэпалі да магазіна і купілі бутэльку гарэлкі. Але пілі, пазбавіўшыся ўжо інваліднасьці, здаровенькія і задаволеныя.

Я доўга насіў гэтую гісторыю пры сабе, кожны раз, сумеўшыся, уздрыгваў, калі ўзгадваў яе. Бо ня ведаю, як каму, а мне быў вельмі сумны яе сэнс, да жудасьці страшны. За гэтым мне бачылася ня проста здарэньне з трыма небаракамі-выпівохамі, а...

Памаўчу зноў жа. Язык не паварочваецца назваць усё гэта сваім імем. Ці ня мы гэта, зьнявечаныя, глухія, нямыя і кульгавыя, вядомыя сьляпымі, ідзем немаведама куды. Толькі не ў цывілізаваны сьвет, бо сьляпы ня ведае туды дарогі, кульгавы і нямы ня маюць сілы ісьці.

У цывілізаваны сьвет нас ня толькі не жадаюць весьці, але і ня могуць. Да таго ж мы самі не жадаем туды ісьці. Бо на гэта ў нас не хапае ні гонару, ні вартасьці. На чале са сваімі сьляпымі павадырамі нам, нямым і глухім, больш собіць біць на сьлязу, жабракаваць, вечна спадзявацца і шукаць халяву, як гэта было зусім нядаўна з расійскім газам і нафтай.

Што ж мы за народ, калі так забываемся на свой гонар, на сваё званьне? Молімся і ўслаўляем сваіх катаў, ліжам ім рукі і ўсё іншае. Ці народ мы пасьля гэтага. Чаму мы так любім пакутаваць, ня памятаючы пры гэтым пра сваіх пакутнікаў, на іх магілах ставім помнікі іх забойцам і катам. Дзе нашая нацыянальная вартасьць і годнасьць, ці ёсьць у нас, я ўжо не кажу – гістарычная, хаця б кароценькая, аднадзённая памяць? Самі мы страцілі, выракліся яе, ці нам дапамаглі? Кастрыравалі на гэтую памяць.

І як гэта ні горка прызнаваць, людзей, кастрыраваных на нацыянальнасьць, на Радзіму, з кожным днём усё болей і болей. Асабліва многа іх у так званым чынавенстве з іх гадзючным атрутна-хлусьлівым *дзьвюхмоўем*, ва ўладных структурах з іх прыроднымі схільнасьцямі і ўмельствам да таго ж дзьвюх-, а то і трохмоўя: адна мова – народу, другая – сабе, мо каб салгаць ужо і самому Богу. Бо адзіная іхняя мова, якую яны засвоілі, – напарсткавая: спакушаць, зачароўваць. І дурыць, дурыць, дурыць.

Дурыць уладна, пасадна і легітымна, таму што разам з нацыянальнай і гістарычнай кастрацыяй утвораная і кастрацыя на сумленьне, праўду і вартасьць. І ўсе мы добра ведаем пра гэта, але скарочаныя на памяць продкаў, пазбаўленыя сваёй мовы і слова, маўчым, дыхаем цішком у анучку, іншым разам хаваючы ад сябе гэтае дыханьне і нават нашую нацыянальную анучку. Вінавацімся. Бо, як кажуць, ведае ўсё ж кошка, чые сала зьела. Ад такога веданьня паходзіць і нашая славутая памяркоўнасьць з усімі яе наступствамі кшталту наступстваў Чарнобылю.

Але ў гэтай нашай закарэлай адвечнай вінаватасьці, умлелым одуме, мне здаецца, нас, як заўсёды адбываецца з беларусамі, абышлі і апярэдзілі. А ўвогуле – ці не падставілі, як падстаўляў нас з веку ў век старэйшы брат на вынішчэньне ўзброенай Еўропе, а тая ж Еўропа, цывілізацыя, разьлічвалася намі з усімі перамоганоснымі і сухімі ва ўсіх водах нашымі суседзямі. Ці не адсюль і зусім ня так, як у людзей, растуць у нас ногі, ці не адсюль паходзіць і нашая мо галоўная бяда, нашае самаедства ад таго, што, здаецца, так ужо гістарычна склалася, нібыта мы людзі другога кшталту. Па ўсім, мы самі паверылі ў гэта, нас прымусілі.

А прэтэнзіі нашыя дасягаюць касьмічных вышыняў. Толькі, на вялікі жаль, гэтае стоенае ў нашым беларускім мяху глабальнае шыла пачынае калоць нам у адно месца. Мы выкрываем сябе і агаляемся на пацеху ўсяму сьвету. Пачынаем гаварыць не сваім голасам, голасам, які ўвогуле не ўласьцівы беларусу. Пачынаем верашчаць, некаму пагражаць і ўпадаць у звычайную істэрыку жанчын у іх крытычныя дні. І адразу ж навідавоку ўсім нашая правінцыйнасьць, адсутнасьць пасьлядоўнасьці, думкі і логікі. І што найбольш засмучае і бянтэжыць – непавага да сваіх жа суайчыньнікаў і грамадзянаў, нібыта ўсе яны крыху дэбільныя і амаль што пагалоўна бяспамятныя. І гэта ўжо само па сабе адмаўляе дзяржаўнасьць, народ і яго сумленьне, сумленьне, нягледзячы ні на што захаванае і пранесенае ім праз стагоддзі. Ідзе выхаваньне і вырошчваньне новага народу, падобна, такога ж самага, які і сёньня сплочвае за свае нявінныя правіны людзям амаль усяго сьвету, у тым ліку і нам.

Асабліва гэтыя новыя парасткі сёньня прыкметны ва ўладных структурах, сярод так званых вертыкальшчыкаў, якія маніпулююць амаль што ўсім: лічбамі, фактамі, словамі, і сваёй і чужой вартасьцю і годнасьцю: якую выніковую лічбу загадалі вывесьці ўсенародна абранаму пад час яго выбараў, такую і накрэмзалі. Загадалі на адным з полацкіх заводаў арганізаваць стыхійны рух за памяншэньне заработнай платы – і рух такі стыхійна ўзьнік. Такім чынам можна чакаць, што ў хуткім часе нас, як таго цыганскага каня, будуць адвучаць ужо і зусім есьці: каня ж адвучылі, хаця, на жаль, ён здох.

Найбольш прасунутыя і дасьціпныя сацыёлагі сьведчаць, што жыцьцё, наш век – гэта век готыкі. Дапытлівых адсылаю да слоўнікаў і энцыклапе-

дый, туды ж раю зьвярнуцца і творцам гэтага веку, мо хоць крыху адукуюцца. Сам жа ціха пра сябе жахаюся: бедная, бедная, кульгавая, невідушчая і глуханямая нашая беларуская готыка. І ня самым апошнім зьвяном у гэтай готыцы зьяўляецца нашае тэлебачаньне, амбіцыі і прэтэнзіі якога ці не вышэй Астанкінскай дый Эйфелевай вежаў, разам узятых. Ужо некуды зьніклі такія каналы, як НТВ, РТР, першы расійскі. Ёсьць толькі НТВ-Беларусь, РТР-Беларусь, а пра ОНТ і гаварыць няма чаго. І хочацца запытаць, як тыя палешукі некалі пыталіся пра тое, ці ёсьць за Гомлем людзі. Дык – ці ёсьць людзі і тэлебачаньне па-за Беларусьсю і яе тэлебачаньнем.

Некалі прэзідэнту задалі пытаньне, ці не хаваецца за такой беларусізацыяй блакітных экранаў скрытая цэнзура. Яго адказ, зразумела, вядомы: не. Такі і толькі такі, і інакшым быць ня можа. Застаецца толькі ўздыхнуць, інакшага нам у гэтай краіне ня дадзена. І мы непаразумела ўздыхаем, калі вечарам націскаем кнопку сваіх тэлевізараў: куды гэта падзелася перадача, абвешчаная ў праграме ТБ. Асабліва гэта тычыцца перадач пра дыктатуру Сталіна, культ асобы. Усе расійскія пазнавальныя, інтэлектуальныя, культурныя праграмы калі не ліквідаваныя, дык загнаны на такі час, што іх можна было б назваць: “Для тых, хто ня сьпіць.” Сваіх праграмаў такога кшталту ў БТ няма. Рубрыкі амаль усе запазычаныя з расійскіх каналаў. Усё, апроч “Тэлебарометру”, другаснае, а гаворачы сваімі словамі, крадзенае, накшталт брэнду да нядаўняга часу папулярнай песенкі «Немного солнца в холодной воде». Зусім не беларускае гэтае сонца, як і вада. У Францыі недзе ў шасьцідзясятыя гады пісьменьніца Франсуаза Саган выдала аповесьць пад назвай «Немного солнца в холодной воде». Аповесьць стала зьявай, нават дала новы накірунак разьвіцьцю еўрапейскай літаратуры. Ну, а песенка?..

Зьдзіўляе ня тое нават, што беларускага гледача трымаюць, скажам сьціпла, за ёлупня. Бессаромнасьць, нахабнасьць, з якімі маніпулюць ім. Як некалі ў дарэвалюцыйных яшчэ рэстаранах так званыя палавыя, афіцыянты, па-булгакаўску падавалі асятрыну другой, а то і трэцяй сьвежасьці, не зважаючы на тое, што ўжо ўвесь сьвет, дзякуючы літаратуры, мастацтву і ўласнаму носу, ведае, што асятрына бывае толькі сьвежая ці... І хаця мы той асятрыны ні першай, ні другой сьвежасьці і ня нюхалі, але добра ведаем, як, чым і адкуль пачынае патыхаць неспажыўная рыба, хай гэта будзе нават кілька ці наш славуты пячкур.

Неспажыўнае ёсьць неспажыўнае, як бы ня пнулася. А на БТ стараюцца, пнуцца. Куды і на што толькі ня кідаюцца, каб падняць так званы рэйтынг. Уражаньне, што ўся Беларусь захопленая футболам. Замежным, менавіта ангельскім. І хто ведае, мо мы ўжо сапраўды ангельцы, бо свайго футболу ня маем, а тое, што маем...

На што ў нас больш усяго здатныя – гэта, як гаворыцца, вешаць свайму народу і ўсяму сьвету, а найбольш усяго замежнай правінцыйнай прэсе, якія мы харошыя і прыгожыя. Чэсныя і сумленныя, праўдзівыя і дэмакратычныя. Як мы дбаем пра той жа народ і краіну, іх заможнасьць і незалежнасьць. Крычым пра гэта на кожным скрыжаваньні. З запалам жабракоў-правінцыялаў, мо і сапраўды чэсных, але звыклых жыць з працягнутай рукой, бясконца наракаць на лёс, ня столькі рабіць, колькі зырыць, дзе што пагана ляжыць, каб цішком прыбраць і пакарыстацца.

І з такой чэснасьцю і сумленнасьцю, пазбаўленай годнасьці, самае большае, на што хапае здольнасьці – гэта падгледзець і вынайсьці веласіпед. Вынайсьці, трохі ведаючы, што ён ужо ёсьць, але недзе і сумняваючыся больш у сваім народзе, у тым, што народ нешта ведае пра веласіпед. А калі ведае, то спадзяючыся, што народ гэты зробіць выгляд, нібыта ўпершыню той веласіпед бачыць, кінецца цалаваць рукі і ногі месііі-вынаходцу. Кінуцца ўсе, хто ня мае творчай сілы дзеля разьвіцьця і пашырэньня ўжо існуючага. Ня мае ні розуму, ні імпэту, ні здольнасьцяў на грахоўнае абвяржэньне і азарэньне – нараджэньне свайго.

Вось так мы адраджаемся і пашыраемся, корпаючыся ў старажытных сьметніках адрынутай ужо культуры, палітыкі, ідэалогіі, з асалодай патомных халопаў і чаляднікаў чхаем ад нафталіну і не наздароўкаемся самі сабе. Пашыраемся зусім не па нашым славутым земляку Дастаеўскаму. Больш трымаючы ў галаве яго ж, але не пра нас моўленае, што чалавек сёньня занадта ўжо шырокі, а тое, што не пашкодзіла б яго і абвузіць. І з апошнім спраўляемся выдатна, нібыта дзеля гэтага стары Хаттабыч і выпусьціў беларуса з бутэлькі. (Дарэчы, бацька Хаттабыча Л. Лагін – з Беларусі, працаваў некалі рэдактарам “Чырвонай змены”, ці не таму гэтую беларускамоўную газету і прыдушылі? І мы душым сябе, абвужваем на кожным кроку, на кожным уздыху і нямым крыку.)

З аднаго боку, мо гэта і не бяда. Даўно ўжо на белым сьвеце цесна ад людзей, а тут яшчэ нейкія невядомага паходжаньня, роду і племені чалавечкі пад нагамі блытаюцца. Вось мы і стараемся нікому не замінаць, усё болей і болей завужваем сябе, і што найбольш небясьпечна, прастору свайго духоўнага існаваньня. Завужваем да кончыка ўласнага носа, да таго, што ў нас пад тым жа носам, нашымі нагамі. Да відавочнага і таго, што можам памацаць рукамі, узяць у рукі, укласьці ў рот, праглынуць, пераварыць і... Зноў лыка ды мачала. Ці не таму, адгарадзіўшыся ад усяго сьвету, мы проста выпалі з яго, сталі ці ня лішнімі людзьмі на сьвеце.

Перакінуліся ў непатрэбных, лішніх сьвету людзей таму, што ў камуністычна-калгаснай школе былі ці ня лепшымі вучнямі, выдатнікамі, за што іх вылучалі і любілі. І ў той наскрозь працятай метастазамі ідэалогіі школе з класічнай культурнай спадчыны яны добра і назаўжды засвоілі, што на сьвеце толькі два лішніх чалавекі: Анегін ды Пячорын. І ня бачылі, што нешта іх вакол нас ці не занадта ўжо, ці не занадта тых, хто не знаходзіць сябе, свайго месца ў сацыялізме, хто выпаў з яго нішы, выпаў з сацрэалізму як метаду духоўнага і творчага існаваньня, увогуле з вялікай і магутнай сістэмы. Што на самым пачатку – гэта папярэднікі будучых дысідэнтаў, папярэднікі тых, каго потым назавуць шасьцідзясятнікамі. Цэлага пакаленьня, роля якога ў грамадскім жыцьці і маючых адбыцца ў ім зьменах і сёньня яшчэ ня вывучана і замоўчваецца, бо кожная ўлада, усе ўлады, як, дарэчы, і народ, баяцца тых, хто мае сьмеласьць думаць самастойна. Яскравы таму прыклад – абраньне амерыканцамі сваім прэзідэнтам Джорджа Буша з яго так званым IQ у 91 бал, калі яго апанент меў IQ, роўны 180 балам, такія ж паказчыкі інтэлекту былі і ў Клінтана. Але разумныя людзі ўжо надакучылі Амерыцы, як яны надакучылі ўсюды і ўсім.

І Беларусь заўсёды душыла, якім бы ні быў лад, пільна адсочвала праявы інтэлекту. Душыла яго нават кволыя парасткі: ва ўніверсітэтах, акадэміях, ня згадваючы ўжо пра людзей простых, думаючых. Таму мы амаль што ня

ведалі дысідэнцтва і разьмінуліся з пакаленьнем шасьцідзясятнікаў, не пачулі яго голасу. Не пачулі ў заалагічным непрыманьні таго, што забаранялася зьверху, што загадвалася не прымаць, з чым заклікалі змагацца. І неўпрыкмет, падобна, пакончылі сваё ўласнае інтэлектуальнае разьвіцьцё, сваё духоўнае жыцьцё самагубствам. Самі ў сваім змаганьні з уяўным ворагам наблізіліся, зьліліся і перакінуліся ў ворагаў сапраўдных – ворагаў самім жа сабе, нашчадкам, сваёй будучыні. Прасьцей кажучы, нашае айчыннае народнае самаедства перайшло, пераўтварылася ў канібальства. Народ прывучылі да чалавечыны.

А хто хоць аднойчы паспытаў чалавечыны... Запытайцеся ў кожнага з прэзідэнтаў краінаў постсавецкай прасторы: ці згодны яны зноў перайсьці на гавяду.

Дваццаць першае стагоддзе, трэцяе тысячагоддзе ад нараджэньня Хрыста, згаладалася па чалавечыне. Колькі ўжо часу яно ў гнілым тумане схаваных нам гадоў адлоўлівае бязмоўных, рахманых беларусаў, гнюсіць чачэнаў ды іракцаў, але апошнім годам ня грэбуе і амерыканцамі, якія не да канца, пэўна, і самі пераварылі індзейцаў, ня проста народаў, а мацярык, пласт так да рэшты і неспазнанай чалавецтвам цывілізацыі і культуры. Але бягучаму часу больш да спадобы старая Еўропа і еўрапейцы, а сярод іх – мы і старэйшы брат, хаця насамрэч ён малодшы. Так, сапраўды мы старэйшыя, прабачце за таўталогію, за свайго старэйшага брата-русіча. Пра гэта сьведчаць шматгадовыя дасьледаваньні нашага суайчыньніка, доктара навук, пра якога я ўжо згадваў вышэй, генетыка, імя якога на Беларусі амаль нікому невядома. Затое яго ведае адукаваны сьвет, толькі ў той сьвет яго ня вельмі выпускаюць. Звычайная для нашай бацькаўшчыны справа. Ён і доктарскую абараняў не ў Беларусі, а ў Расіі. Тэмай ягонай дысертацыі якраз і было дасьледаваньне аседласьці, працягу і ўстойлівасьці жыцьця карэнных жыхароў на Беларусі. Ён устанавіў і даказаў, што як мінімум па нашай краіне прайшло і на ёй жа супакоілася крыху больш двухсот пакаленьняў беларусаў. Кладучы на кожнае пакаленьне па дваццаць гадоў – гэта больш, чымсьці сорак вякоў. Расія такой стабільнасьці, адзінства жыхарства і тэрыторыі ня ведае. Расійскія вучоныя пагадзіліся з генетыкам-беларусам. Але няма прарокаў у сваёй айчыне. Немагчыма яго існаваньне, як, дарэчы, і дысідэнта, там, дзе ўладарыць ня ісьціна, а праўда сілы і кулака. Немагчыма яго існаваньне там, дзе дыпламаваны гісторык можа сказаць, што Францішак Скарына – пецярбургскага паходжаньня, нібыта горад і беларус равесьнікі.

Вяртаючыся да напісанага крыху вышэй, да вайны помнікаў расіянаў і эстонцаў, узгадваецца выказваньне, дзе тлумачацца прычыны гэтай вайны. Меркаваньне, што падставы яе – траўмаваная рэпрэсіямі сталінскага рэжыму памяць эстонцаў. Чаму ж мы такія цьвердалобыя, чаму ж гэтая памяць стагоддзяў нашага народу ніколькі не траўмавана ў нас?

І мімаволі прыходзіш да сумных высноваў: таму што мы ўвогуле ня маем такой памяці. Мы страцілі, у нас сьцерлі яе. Сьцерлі, зразумела, у тых, у каго было што сьціраць. Увогуле здаецца, што мы народ пазагістарычны. Далёка па прыклады хадзіць ня трэба. Скажу пра самога сябе. Як бы там ні было, я скончыў восем класаў беларускай школы. А што ж з беларускага я павёз у Сібір, з якім веданьнем Айчыны пайшоў у сьвет? Так, лічы, з ніякім. Бо больш ведаў гісторыю старажытнага сьвету, усякіх там этрускаў,

рымлянаў і грэкаў. І сам быў ці не этрускам, нейкім касьмічным прыхаднем з глыбінь вякоў. Нічога ні пра сябе, ні пра сваіх продкаў. У памяць урэзаўся толькі малюнак хлопчыка з падручніка гісторыі Беларусі: шклоўскі выкапень. Ды і то таму, што быў ён вельмі страшны і паходзіў з аднаго недалёкага ад мяне гораду Шклоў – беларускага гораду. Зямеля, зямляк – брат мой, лічы.

Дык ці ня ўсе мы такія ж рэлікты шклоўскія, амаль пячорныя прыхадні трэцяга тысячагоддзя на сваёй роднай зямлі. Ні перад намі, ні за намі Беларусі і беларусаў няма. Жывем адным толькі няцямным днём. Ствараем нейкія міфічныя саюзы і саюзныя дзяржавы, ня дбаючы аб дзяржаве сваёй. Прымушаем дзяцей вучыць ці мучыць кітайскую мову, цалкам занядбаўшы сваю. І ці не жаўцеем пакрыху, а то мо і рудзеем ад неасэнсаванага смутку па самім сабе, па нашай траўмаванай, згвалтаванай і пакалечанай памяці.

Ці не таму мы, беларусы, не наракаючы, а калі меркаваць па нашай прэсе, дык з радасьцю і адданасьцю нашай уладзе і правадыру, з усёй нашай шчырасьцю, працавітасьцю дысцыплінавана і арганізавана параённа з песьнямі са Славянскага базару (няма базару, як кажуць крымінальнікі) адыходзім на той сьвет: штогод 38-40 тысячаў нябожчыкаў. Шчасьлівыя людзі на гэтым сьвеце не затрымліваюцца.

А што тычыцца тых, хто вымушаны затрымацца, зьведаць да канца сваю Галгофу, як зьведалі яе Быкаў, Ганчар, Завадскі, Захаранка і пакуль яшчэ не прысыпаны зямлёй, але ўжо цалкам тагасьветны, сьвежанькі калектыўны нябожчык Саюз беларускіх пісьменьнікаў, а ў чарзе, думаю, стаяць Саюз мастакоў і іншых палякаў. Ім ужо ніхто не дапаможа. Бо яны сапраўды лішнія роднай зямлі, народу – айчыне. Айчына выраклася іх, як выраклася сама сябе, адмовіў цывілізаваны сьвет, дарогу туды, да храму, сваёй культуры і нацыянальнасьці. Выракліся этыкі, маралі і спагады, чалавечнасьці ў адносінах да чалавека. Найбольш яскравае сьведчаньне гэтаму вельмі шматзначная зьява на нашым тэатральным Парнасе, ці не апошні акт нашай нацыянальнай трагедыі. Трагедыі, якая разыгралася не па пісаным, з чыстага аркушу паперы па загадзе сэрца кіраўніцтва і акцёраў Рускага дзяржаўнага тэатру. Я маю на ўвазе звальненьне, выгнаньне з Алімпу таленавітага маладога артыста Паўла Харланчука. Ня маю жаданьня гаварыць, як і чаму гэта адбылося, ня маю жаданьня называць і прозьвішчы ганіцеляў. Адно толькі засьведчу: усе яны ствральнікі і сталпы нашай айчыннай культуры. Горка, балюча, крыўдна.

Толькі паслухайце класічныя інквізітарска-макіявелеўскія рэплікі, што падавалі яны адзін аднаму на мастацкім савеце тэатру: «На законных основаниях ты уволен быть не можешь. Но ты по политическим и идеологическим мотивам отстранен от участия в спектаклях…» Чым не тэатр абсурду? Дарэчы, у працяг тэмы і сьпектаклю, распачатага на рускай сцэне: ідэалагічная камісія нядаўна створана і на Камароўскім рынку, што, пэўна, аўтаматычна: Харланчуку няма месца і там. Вось так, панове. Вось так у нашым прыгожым мастацтве са словамі А.С.Пушкіна: «И милость к падшим призывал».

Але пойдзем далей у сюжэт, пэўна, усё ж фарсу, з чаго, па ўсім, пачынаюцца ўсе трагедыі сьвету.

«Мы договаривались с тобой, что ты скажешь: я совершил преступление. Ты этого не сделал. Революционная настроенность опасна, вредна. Единственно, что бессмертно, это искусство...»

І апофеоз, маналог мэтра:

«Есть президент, который очень хорошо относится к театру. Не хотелось, чтобы это мнение изменилось. Мы оказались заложниками ситуации: уволить не можем, и принять позицию Павла тоже… Ты не пропадешь, ты очень талантливый человек. Но мы так жить дальше вместе не сможем…»

Апошняе, петытам, у якасьці рэмаркі:

«Для театра грядет подтверждение звания «Национальный». Результаты подписывает Президент. Это звание мы завоевывали годами, вы его поставили под угрозу лишения».

Памрыце Дудараў з Курэйчыкам, перавярніцеся ў трунах Крапіва з Макаёнкам, дый ты, Вільям Шэксьпір, паварушыся на тым сьвеце і пачухай патыліцу – вам на Беларусі, а тым больш у рускім нацыянальным тэатры месца няма: выпруць – рот разявіць не пасьпееце, дый таленту вашага тут ня хопіць. На біржу, на біржу, панове.

Мне не хацелася б тут нікога выкрываць і выказваць абурэньне. Сама сітуацыя – звальненьне чалавека толькі за тое, што ён у свой час наведваў намётавы гарадок на Кастрычніцкай плошчы, падзяляў пратэст супраць выбараў, якія і сам прэзідэнт, хоць і мімаволі, вымушаны быў прызнаць падтасаванымі і таму не зусім правамоцнымі, адымае язык і мову, калечыць розум, вымушае мяне быць сьляпым, глухім і нямым. І мне шчыра шкада тых, хто прарабляе такое са сваім народам, і тых, хто з Алімпу апладыруе зьдзеку з яго.

У сувязі з гэтым і моўленым ужо вышэй пра наш век — эпоху готыкі, прыгадваецца недзе чытанае: уся гатычная традыцыя пабудаваная на прывабнасьці страху. І таму ў дадзеным выпадку больш бачацца апалагеты і апалагетыка гэтага прывабнага нацыянальнага страху. Як не мяркуй, а мастацтва ўсё ж зьява празарлівая і прарочая. Яно заўсёды наперадзе таго, што грамадства толькі пачынае адчуваць і асэнсоўваць. Сёньня кожны грамадзянін і жыхар Беларусі павінен няпроста зьведаць пачуцьцё страху, але і зразумець яго прывабнасьць. І хто, як ня творцы, у першую чаргу павінны данесьці гэта да масаў, што і прарабілі кіраўнікі і артысты Рускага дзяржаўнага тэатру.

Футбол англійскі, песенкі французскія. Але ўсё гэта можна было б лічыць дробязьзю. Лічыць дробязьзю, калі зусім не глядзець БТ, увогуле не ўключаць яго, не чытаць газет. Але калі ўключыш, разгорнеш дзяржаўную газету, дык зноў жа ад асятрыны другой сьвежасьці хочацца нос заціснуць. Чаго толькі варта адно, як капіруючы маскоўскіх дыктараў з падскокам-прыплясам зьяўляюцца беларускія телевядучыя, як яны старанна, “по московски” падціскаюць ножкі, якія маскоўскія позы займаюць і жэстыкулююць. А пранонс, пранонс які, так і чуецца “рюсское”: пнааехали, пнимаешь, в нашу Маааскву. І вось менавіта гэта – адсутнасьць сваёй інтанацыі, свайго голасу і, зразумела, сваёй беларускай мовы, як гэта не жахліва гучыць, перш-наперш і аб’ядноўвае ўсе нашыя СМІ і ўладу. Паўтаруся, гэта сапраўды страшна, жахліва для нашай будучыні. Такое

аб’яднаньне нагадвае мне зноў жа трох калечных маіх родзічаў: сьляпога, глухога, нямога.

Магільшчыкі заўсёды ідуць паперадзе нябожчыкаў. Прывід прывабнага страху, страху адлучэньня ад кармушкі, пазбаўленьня званьняў, узнагарод і проста работы ходзіць сёньня па ўсёй постсавецкай прасторы. І як ня крыўдна, бацькаўшчына гэтага прывіду – Беларусь.

Вось такая нашая айчынная нацыянальная готыка. Готыка краху творцаў і творчасьці, інтэлекту і інтэлігенцыі, культуры ў цэлым. Да гэтай кагорты я б яшчэ дадаў і апазіцыю. А крах апазіцыі, мяркуючы па паводзінах старшыні Грамадзянскай партыі Анатоля Лябедзькі, нават больш, чым відавочны. Калі ў яго спыталі, што ён думае пра звальненьне Харланчука, ён адказаў: “Калі Харланчука выключылі па палітычных матывах, то мы будзем разьбірацца...” Праўда, пры гэтым не высьветліў, з кім разьбірацца: з самім Харланчуком, ці з адным са сваіх паплечнікаў, стваральнікаў Грамадзянскай партыі, якім зьяўляецца ніхто іншы, як мастацкі кіраўнік Рускага тэатру.

Зноў жа, готыка, готыка, готыка, панове, тая ж самая готыка, якая амаль што стагоддзе доўжыцца ў нашым жыцьці. Сёньня яна працягваецца, толькі творцы яе людзі, мякка кажучы, ня надта адукаваныя. Пэўна, зноў, як некалі ўжо амаль пры камунізму і пад камунізм ствараецца новая нацыя, чалавек, культура (лыка ды мачала з апошняй, неабадранай яшчэ будаўнікамі сьветлай будучыні лазіны Палесься).

Я ня супраць гэтага тварэньня. Калі ёсьць, калі аб’явіўся новы месія, хай сабе месіць. Як у тым старым, вельмі любым, кажуць, Якубу Коласу анекдоце. Бацька з сынамі ідзе па дарозе (ці не да храму?), і тут перад імі канава. Адзін сын разагнаўся, пераскочыў, другі таксама. І бацька сьледам за імі пераскочыў. Сыны гавораць паміж сабой: глядзі ты, стары пень, а як скача. На што другі адказвае яму: ну што так пра бацьку – пень. Пень. Скача, хай сабе скача, што сабака.

І ў гэтай сітуацыі мяне больш цікавіць ня бацька. Браты, сынкі-паплечнікі. Я прыглядаюся да іхняга твару, твару настворанах сыноў эпохі – увогуле, рабіць гэта – наш абавязак, – ужо некалькі гадоў. У горадзе, у вёсцы, падчас адпачынку і працы. Прыглядаюся да хатніх і службовых твараў, імгненнага ўжытку і вечных – у каханьні, нянавісьці. Ці не адзіны варты жыцьця занятак сёньня, калі ў чалавека мастацтва ў краіне ачмураных, глухіх, зьнямелых няма іншых сродкаў засьведчыць сябе, занятак чалавека, у якога таксама вырвалі язык, забілі слова, мёртвым матыльком прыкнопілі да аркушу паперы і замкнулі ў шуфлядзе ўласнага пісьмовага стала.

Але гаворка не пра гэта, хаця і пра гэта таксама.

Які ж сапраўды сёньня твар у чалавека нашага часу. Твар чыноўніка, службоўца, што ўчора прагінаўся, а калі хрыбціна адмовілася гнуцца, пабег у змагары за народную долю і маю асабіста волю, лёсавызначальны твар народных абраньнікаў – дабрадзеяў і дойлідаў. Ці ёсьць розьніца паміж тварам нашай эпохі, якую мы так шалёна і люта клянём, ці ж наблізіўся, стаў любым мне твар новага стагоддзя? Стагоддзя, якога мы так некалі чакалі і праглі. Ці ж такога чакалі, падалі ніц і разьбівалі лбы мы і нашы бацькі – пераводзілі народы з гавяды на чалавечыну ў імя сьветлага будучага. Як там будзе з гавядай і чалавечынай заўтра і па заўтраму? Што

зварыцца ў нас у трэцім міленіуме, як там з трыма хлебцамі ў новаабвешчанага месіі? Дазвольце ж мне зазірнуць яму ў вочы, убачыць іх вялікасьці твар. Які ж ён? І чагоківаць на іншых? Мо гэта ў мяне самога твар крывы? І ні на каго іншага, гэта я на самога сябе гляжу ў люстэрка і касавуруся – бляваць верне...

Так, сапраўды – верне. Бо іншым разам я пачынаю шкадаваць і любіць сябе. Думаць: а чаго мяне так касавурыць. Паводзіць сябе як той небарака, прабачце, у старым анекдоце. Небарака, які ня вытрываў жыцьця і вырашыў скончыць яго самагубствам. Ужо і крук прыгледзеў, і вяроўчыну прыдбаў, і пяцельку прыладзіў сабе на шыю. Ды раптам, з пятлёй ужо на шыі, убачыў, што на донцы пляшкі засталося яшчэ грамаў пяцьдзесят гарэлкі.

Не прападаць жа дабру. Ён хуценька каўтнуў тыя рэшткі гарэлкі – і зноў у пятэльку. Але ў апошнюю хвіліну прыкмеціў на падлозе ладны такі недакурак. Прыпаліў яго, смокча і ўжо не без лагоды да сябе мяркуе: нешта я ня тое надумаўся рабіць – жыцьцё ж наладжваецца.

Вось і я іншым разам ускіплю, памахаю крыламі, а потым з той жа, звыклай нам памяркоўнасьцю, думаю: чагойта ўсё бурчу, нярвуюся і наракаю. Жыцьцё ж сапраўды наладжваецца. Ну, плюнулі і плююць табе ў твар – утрыся, Божая раса. Вартасьці і годнасьці патрабуеш – на тым сьвеце ўсе будуць аднолькава вартыя і годныя, там табе ні мова, ні слова – твая беларушчына – ужо не спатрэбяцца. А на гэтым – ты ж ня голы і ня босы. І з голаду ня мрэш. Некалі ў дзетдоме думаў, што на дзень хопіць паўлітра ці літра малака і батон. Сёньня ж маеш значна болей. Як гаварыла адна з дзетдомаўскіх выхавацелек: самавар у мяне кіпіць пастаянна, цукар паступае рэгулярна. Але чаю я ўжо ня п’ю прынцыпова – як выйшла замуж, так і кінула піць. І табе варта абыходзіцца без гарбаты, бо ты сам ужо гарбаты. Нічога, нічога, і беларуса магіла выпрастае.

А тое, што страшна так жыць, калі ўсе і кожны, і штодзень нагінае цябе – гэта не бяды. Адной таксама было страшна. Але вытрымала. І нарадзіла яшчэ трох. Упадабала той свой страх, бо, пэўна, у ім сапраўды найвялікшая прывабнасьць жыцьця – у прывабнасьці страху. І я, чаго крывіць душой, апошнім часам таксама пачынаю адчуваць прывабнасьць свайго страху. І адсюль мая горыч і страх перад самім сабой. Так, я баюся сябе, бо часам адчуваю, што магу ўжо і зарохкаць, як таго патрабаваў прапаршчык ад салдата, калі злавіў апошняга на смажаньні ўкрадзенага ім парасяці. “Каб к раніцы зарохкаў”, – гледзячы на забітае парася, загадаў. Ня ведаю, зарохкала тое парася ці не, але я ўжо падрыхтаваны рохкаць. А шмат хто ўжо і рохкае.

Але маё прыватнае рохканьне ў час усеагульнай стабілізацыі ў краіне і пагалоўнага росту дабрабыту насельніцтва ёсьць толькі маё прыватнае парасячае рохканьне. Як гаворыцца, пад’еў – і ў хлеў. Куды большую цікаўнасьць выклікае тое, што адбываецца з іншымі, больш значнымі асобамі. Зазірнём жа ў вочы і ім, паслухаем іх галасы. Пагадаем, як сьпяваецца ў песьні, на караля ці каралёў. А сёньня кароль нашых дзён, адбітак і сколак з іх, блакітны экран тэлебачаньня. Пасьля, зразумела, аднаго жывога і недатыкальнага чалавека, які таксама больш робіць і жыве ў тэлевізары. Дык прыпадзем жа да ног уладара і гегемона – чацьвёртай улады, якая неўпрыкмет пераўтварылася ва ўладу першую. Прыгледзімся да асобаў і твараў, вылучаных гэтымі ўладамі ў нейкім родзе ва ўзорныя: абранымі ў

парламент, на ўсебеларускі сход, прайшоўшымі праверку на вернасьць і педыкулёз і праз гэта дапушчанымі да званьняў чэсных журналістаў, такіх жа чэсных “холдынгавых” пісьменьнікаў і ў кіраўніцтва правільнай моладзі БРСМ (як гэта нагадвае колішняе БСМ — брыгада садзеяньня міліцыі — хоць бы крыху памяці. А з другога боку, мо ў гэтым гістарычным бяспамяцтве і хаваецца наша шэрая сярмяжная праўда?).

На гэтым БСМ хочацца спыніцца асобна — іх яшчэ басмачамі называлі, пэўна, праз час адчувалі нешта агульнае з маджахедамі — маё пакаленьне помніць іх заклятых ворагаў — сьціляг, тое, як наша доблесная БСМ з ухваленьня ўлады змагалася з прыхільнікамі такога ж варожага, як сёньня НАТА, аматарамі джазу («Сегодня он играет джаз, а завтра родину продаст”), доўгіх валасоў, шырокіх калашын, штаноў, якія не дазволяць адбыцца залпу “Аўроры”, яркіх гальштукаў. Згадваючы ўсё гэта, асабліва гальштукі і штонікі, ці не з-за іх, дзякуючы пераможнаму змаганьню з імі партыі і камсамола, ляпнулася імперыя Савецкі Саюз. Асабліва з-за штонікаў. Мала іх было ў народу, і ўсе толькі партыйнага ўзору, у якіх не знайшлося месца нават сэксу.

Вялікае змаганьне партыі, ураду і камсамолу прывяло краіну да вельмі сумных вынікаў. Сьцілягі, а разам з імі беспартыйныя і ідэалагічна нявытрыманыя парткі перамаглі. Накаутам. Былыя сьцілягі, суценёры, альфонсы і фарцоўшчыкі, як сёньня гавораць, тэрмінова памянялі арыентацыю, кінуліся ў камсамол, пабраталіся з ім. Паварыўшыся ва ўладным катле нават блакітныя сталі ярка чырвонымі. І... што тут гаварыць. Вазьміце ў рукі сёньняшні даведнік, як сказаў пра яго М.С.Гарбачоў: ху із ху. І вы адразу ўбачыце ўсю ху.

Былыя сьцілягі ў выніку змаганьня з імі пераўтварыліся, перакінуліся ў алігархаў. І ня проста алігархаў, а ўладароў сусьвету. А ў каго гэта не атрымалася, – у простых абраньнікаў народу: дэпутатаў, прэзідэнтаў і шэрых кардыналаў, паханоў. Такім чынам, у нашыя дні ўжо на магіле, хаўтурах камунізму яшчэ раз бліскуча спраўдзілася і пацьвердзілася ленінскае: единство и борьба противоположностей – няма ў сьвеце адзінства, няма і супярэчлівасьці, а толькі сярэдняе паміж імі, як “А” і “Б” на трубе, пэўна, газавай, ад якой і на якой скача сёньня ўвесь сьвет і, канечне ж, усе наваствораныя алігархі, дарэчы, у ладных штоніках і пры мадняцкіх гальштуках. І пераважна пад той жа калісь непрымальны джаз.

Сочачы за гэтымі скокамі, прыглядаючыся да экранаў тэлевізараў, ня грэх было б вярнуцца і крыху назад, да стэндаў, якія былі папулярныя ў часы нашай маладосьці: «Их разыскивает милиция». Амаль знаёмыя ўсё твары. Толькі шыльдачкі памененыя, імідж зусім процілеглы. Імідж, які вызначыў сёньняшні дзень, зрабіўся носьбітам твараў бягучай эпохі. Якія дзіўныя метамарфозы, якія вытанчаныя глёкі, глюкалы і загагуліны. Яны нават і ў страшным сьне не маглі прысьніцца аматару і бацьку апошняга слоўца Барысу Ельцыну – дарэчы, таксама вялікаму загагульшчыку, – ні Яўгенію Яўтушэнку, пра якога ў свой час «Литературная газета» пісала, што ён вызначыўся чарговым зігзагам на літаратурнай сцэне. Ня сніліся ні кукалцы, ні вусеню, ні матыльку і нават самому хамелеону.

Розум, гонар і сумленьне эпохі – партыя – і яе падручны камсамол заўсёды схільныя да балбатні і падману, да чарговай перамены сваёй лініі

праз жабрацтва, гвалтаваньне *беспорочным зачатием* адной шостай часткі сьвету парадзілі сёньня так званых алігархаў. Кланаваліся, дамагліся свайго, вывялі ўсё ж новую пароду гамункулу франкенштэйны дваццатага стагоддзя.

Як там на скрыжылях гісторыі? Не, не ў Настрадамуса нават, у самой Бібліі запісана? Прыкладна: Аўраам нарадзіў Іосіфа. І пацёгся ланцужок да нашых дзён: Іосіф нарадзіў Ягоду, Ягода — Яжова, Яжоў — Лаўрэнція. Берыю... Дык вот так прыкладна пачыналі кланавацца, памнажацца і алігархі. Алігархі, яшчэ не аказваючы сябе, парадзілі кідалаў і лохаў. Кідалы і лохі — пругкую і жортскую біямасу: качкоў і даверлівых старцоў, жабракоў, зладзейкаватых бічоў, бамжоў і дробных бомжыкаў: біямасе ж уласьціва множыцца. Множыцца і ваяваць. Усё роўна з кім, абы толькі ваяваць. Як сёньня гавораць, нас раць і нас раць.

І ўсе яны кінуліся ваяваць. І пачалася бойка. Аднаго з другім, брата з братам. Бо братазабойства, забойства Авеля Каінам было ў іх у крыві, як і самаедства, канібальства. Яны не збылі ў сабе кастрычнік сямнаццатага году, хаця зьверху і патрабавалі выкрэсьліць яго з памяці і календароў: хлусяць усё календары. У прыродзе ж няма кастрычніку. Ёсьць лістапад. Гэты калі адмірае, як адмерла нашая беларуская памяць, ідзе ў нябыт ліст на дрэве, адлятаюць птушкі ў вырай. І гэтыя нябыт і вырай, агонія адыходу парадзілі пачвар. Пазачасная сьмерць, гвалтаваньне мінулага заўсёды даюць жыцьцё выродлівасьці, нелюдзям.

У памяці крыві, у генах усіх і кожнага з нас вайна. Яна, праўда, скончылася шэсьцьдзесят гадоў таму, але нябачна ўсё яшчэ доўжылася і працягвае доўжыцца. Таму што хаця пераможаны бок прызнаў сваю паразу, пераможцы сумняваліся ў гэтым. Апошнім часам дык і вельмі сумняваліся. І з маўклівай згоды і дазволу ўладаў, няздольных рабіць у міры і без крыві што-небудзь стваральнае, гэтыя пераможцы ў сваёй памяці, жабрацтве і старцаваньні працягвалі ваяваць, прыніжаныя і прыгаломшаныя сваёй жа ўласнай славай былой перамогі. І гэта – час ад часу разьвярэджваць, не даваць загойвацца народным ранам – было зручна і новым уладным гамункулам. Усім ім, ужо ўвайшоўшым у смак ад чалавечыны, была патрэбная маленькая пераможная вайна, абы якая, хоць і крымінальная. Праз гэта яны пажыцьцёва і элегантна ўваходзілі і самі ва ўладу. Праз страх іншых, прывабнасьць страху ўваходзілі ў прэзідэнцтва і месіянства.

Толькі на гэтых уваходінах мелася яшчэ адна непрадугледжаная імі загагуліна, глюкаліна. Тыя ж, да прыкладу, качкі, зьнішчаючы кідалаў, незваротна і назаўжды пераўтвараліся ў іх, і наадварот. Закон вечнай бойкі: у ёй не бывае пераможцаў, *покой нам только снится*. А розум, ачмураны жахам крыві, сьпіць у запале, палоне змаганьня.

Сьпіць, і ў сьне яго зноў жа нараджаюцца, плодзяцца пачвары, біямаса для новых боек, будучыя новыя ваяры, якія дамагаюцца свайго месца пад сонцам. Маладыя ваўкі прагнуць чалавечай крыві. І распачынаюць свае гульні з чалавекам, палюбіўшы яго, як некалі воўк упадабаў, палюбіў кабылу. І ці не наступства ўсе мы з вамі гэтых палымяных заляцаньняў драпежніка і той працавітай кабылы. Ці не адтуль бярэ пачатак перакуленасьць нашай заблытанай падманутай грамадскай самасьвядомасьці, плод, што ўзрос

на хлусьні, абяцанках-цацанках і на пракаветным падмане, уласнай крыві і сьлязах бясконцых крывавых пажарышчаў, боек і войнаў.

Хаця, што ў гэтым найбольш дзівіць, як адзначаюць амаль усе ў сьвеце: народ мы зусім не ваяўнічы. Больш за тое, падобна на тое, што беларус створаны для міру – творчасьці і дойлідства, земляробства. Для працы і толькі працы. Але ж неяк так ужо гістарычна і геаграфічна ў прасторы і часе склалася, што мы прыгавораны да вайны. Такая ўжо доля выпала беларусу. З-за дзікунства нашых любых суседзяў, якіх не бярэ мір, якія заўсёдна нешта дзеляць: кабанчыка і кармушку, зямлю і нашую бацькаўшчыну, нашую родную хату, абразаюць па самыя вуглы нашыя нішчымныя соткі.

Сёньня і здаўна мала хто ў сьвеце арэ, сее і косіць, халява і бясконцая тусоўка правяць народамі. А бедны беларус толькі ўзаб’ецца на сваю сірочую сухую скарынку, як і тую ў яго выдзеруць з роту. Ды ня проста выдзеруць, а крывава – апалавіняць зямлю, апалавіняць народ, разьдзяруць, як жабу, сябры і браты, ворагі і дабрадзеі. Пачынаючы ад Грунвальду, Аляксея Цішэйшага, таго ж Суворава і Напалеона, Іосіфа з Адольфам. Прамілы Божа, колькі ж іх было! І яшчэ будзе.

Даў бы нам Бог пажыць па сваёй волі, на сваім хлебе і на сваёй зямельцы. Гэта колькі ж нас было б сёньня. І дзе мы ўжо былі б, каб нам хоць трошачкі пашчасьціла, каб не расьлі мы, як абсеўкі нейкага няпэўнага братэрства, як гарох пры дарозе. Ды народ жа мы, народ. А з нас прымусова зрабілі нейкае пасьмешышча бяз роду і племені. Барацьбіта і змагара, ідэйна вытрыманага балванчыка пад чужымі зноў жа крывава-чырвонымі сьцягамі.

А я хоць і балванчык, але па дзявятае, двойчы і тройчы дзявятае калена, як і ўсе мае родзічы, зусім не барацьбіт. Разумею, пэўна, у гэтым і бяда мая, зусім не барацьбіт. Больш той, каго не без пагарды нараклі пры Саветах – обыватель. Чалавек, які бытуе тут, як бытуе верабей, бусел і чапля. Тубылец я, ці як геніяльна вызначыў мяне і ня толькі мяне, усіх нас наш геній Янка Купала, – тутэйшы. Дазвольце ж і застацца тутэйшым. Дайце ж нарэшце адпачыць ад крыві і вайны тутэйшым. Дайце ж тутэйшым спакою і права на сваёй бацькаўшчыне быць тутэйшымі. Не рабуйце больш мяне, не гвалтуйце. Дайце ж хоць маім дзецям пажыць бяз боек і войнаў, адпусьціце мяне на волю.

Я нема гэта крычу, бо добра разумею: ніхто, сьвет, ні мяне, ні маіх дзяцей не адпусьціць і ня пусьціць. Без вайны і крыві. А крыві ў нас ужо і няма. Што не пралілі проста так на зямлю, тое высмакталі. Вочы нашых матуль даўно ўжо выцьвілі ад сьлёз. Вочы дзяцей Чарнобылю чорныя не ад чарнабылу і радыяцыі – ад суму і падману іх бацькоў. Вочы маёй Прыпяці рудыя зусім не ад торфу, то торфам запяклася кроў пакаленьняў і пакаленьняў беларусаў. Мо таму такое невыразнае і блёклае вясновае неба сёньня над нашымі галовамі. Халоднае і сумнае неба Бацькаўшчыны. Гэта сама перакуленая, раствораная ў нябёсах нашая душа. Перакуленая нашая грамадская сьвядомасьць. А мы на гэтай зямлі, пад гэтымі нябёсамі толькі вынік гэтай перакуленасьці, якой мы абавязаны тым, хто мы ёсьць. Мы стаміліся без жыцьця. Ад ваяўнічай прымусовай нежыці. Ад вечнага прымусовага змаганьня.

Аднаму толькі ў нас чалавеку няймецца, хочацца ўсім, у тым ліку і нам,

і больш нам, даць па мордах і соплях. Дык ці ня выправіць яго на вайну з усім сьветам.Талакой справіць коніка, шабельку і... Тым больш, што мы яшчэ не апрытомнелі ад апошняй, на памяці ўжо кожнага, вайны з самімі сабой, з сваім жабрацтвам і разгубленасьцю, калі нас разьвялі, ababралі і падзялілі на качкоў, кідалаў, лохаў і лахатроншчыкаў. А ўвогуле, усіх зрабілі лохамі і прымусілі біцца паміж сабой.

Сыход бойкі быў прадказальны і відавочны – адсутнасьць пераможцаў. Але гэта дазволіла, дзякуючы страце саміх сябе, страце назаўсёды ўжо цэлага маладога пакаленьня неяк адвесьці душу, супакоіць падманутыя душы. Кідалы, што нарадзілі пачвар-качкоў падчас усеагульнага здранцьвеньня і прыгаломшанасьці, тых жа качкоў і зьнішчылі, узяліся за лохаў.

Але лох вечны, як вечны жыд – хто ж будзе карміць і паіць усіх, калі ня стане лохаў. Але кідалы гэтага не зразумелі. Давялося ўмяшацца нябачным да гэтага лялькаводам. І паўсюдна пачалі нішчыць кідалаў: яны сваю справу ўжо зрабілі. А лохаў трэба было аберагчы і захаваць – для сябе. На кідалаў, іх чырвоныя і чорныя скураныя пінжакі, стрыжаныя (цяпер ужо стрыжаныя, а не патлатыя) галовы, людажэрскія афрыканскія гальштукі, залатыя зубы і пальцы ў цяжкіх пярсьцёнках нацкавалі невядома адкуль узьніклае грамадства. Да грамадства далучылася і міліцыя. Хоць міліцыя на той час была аднаго разьліву з кідаламі – браты-блізьняты.

Грамадства, міліцыя, скіраваныя лялькаводамі, шалелі і енчылі ад праведнага гневу і абурэньня: бічавалі, зводзілі і лупцавалі – выкаранялі.

Кідалы-качкі, лахатроншчыкі, напёрсьнікі зьніклі адначасова і разам, зьніклі з нашых вуліц, нібыта іх карова языком зьлізала, як у свой час маманты, яцьвягі і піянеры. Мы ўсе былі так абураныя імі, лохі ж, лохі, што і не прыкмецілі, як і калі гэта адбылося.

Але неяк, праз гады і гады ўжо, я ўключыў тэлевізар і ўбачыў іх зноў перад сабой. Не. Яны, канечне, перамяніліся, пасталелі, зьнялі з шыі ярмо – златую цепь – клятую спадчыну былой іх цяжкай долі, абвесіліся залатымі крыжыкамі, прыкрылі радзімыя плямы свайго сапраўднага паходжаньня тэатральнымі матылькамі. Толькі, толькі ж недарэмна кажуць: як ты ня пніся, а умище все равно не спрячешь. Былы качок, якім мы так грэбавалі і з якім так змагаліся, ацалеў і памножыўся. Ён стаў тэлетварам нашага стабільнага і стваральнага жыцьця ды й усяго існага. Узорным тварам эпохі.

І дзеля справядлівасьці, імкнучыся быць аб'ектыўным, трэба адзначыць, што твар гэты ў нечым і прывабны. Пакуль не адчыніць рот. Пры ўсёй стандартызаванасьці аблічча, а прываблівасьць іх на адзін капыл, як і ўся сёньняшняя прыгажосьць, і тут ужо нічога ня зробіш – глабалізацыя – яны яшчэ стандартызаваны і ў мысьленьні, у слове, у тым, як мысьлярны працэс вырываецца з іх вонку з некантралюемай хуткасьцю гаворкі хворага псіхічна чалавека. Столькі там намешана пыхаў і фанабэрыі, непрыхаванай пагрозы, агрэсіі і... падспуднага, патаемнага страху, што міжволі робіцца агідна і брыдка на душы. Агідна і брыдка, што ты сярод іх. І простае сьведчаньне, што цябе гэта прыніжае і абражае, ні ў якім разе ня можа быць апраўданьнем, бо ці ня сам ты пракаветным сваім змаганьнем і адвяржэньнем, упаданьнем у блюзьнерства, узвышэньнем і маленьнем зрэбнасьці нарадзіў усё гэта. І хочацца загадаць самому сабе: глядзі ж,

глядзі, не адводзь вачэй ад праўды, бо гэта ж твае вочы, твой твар у люстэрку тваёй жа ўласнай душы.

Але ўсё гэта толькі вынік і крыху мо нясьмелая спроба ўбачыць, адчуць, чаму і што мы маем сёньня. І гэта ўжо дзень мінулы. Мяне ж больш цікавіць і непакоіць нашае сёньняшняе, што крыецца за агульным выразам стандартызаванага твару былога кідалы-качка. Бо, як ні круціся, гэта і ёсьць будучыня, толькі ўжо ня наша, нашых нашчадкаў, дзяцей і ўнукаў. Сумны і змрочны адбітак нашага так і няспраўджанага жыцьця, а дакладней выскал яго, хто ведае, у якім ужо часе і стагоддзі і ці толькі на адной планеце Зямля. Яскравае сьведчаньне краху ня толькі нашага існаваньня на гэтым сьвеце, але дзьвюх тысячагоддзяў існаваньня культуры, інтэлекту і інтэлігенцыі. І больш таго – увогуле цывілізацыі.

Адсюль і адчуваньне горычы і няўтульнасьці жыцьця, і ня толькі ў нас, але ў людзях, чалавеках. А што непасрэдна тычыцца нас, беларусаў, дык перш-наперш самі ж і спалохаліся гэтага адчуваньня. Па закарэлай нашай сьвядомасьці не далі гэтаму веры, веры вачам сваім, сабе. Бо гэта якраз з ліку таго, чаго ня можа быць, і не з нашага балота пра гэта квакаць. Таму мы ня можам паверыць, што гэтай культуры на нашай бацькаўшчыне і знаку не засталося. Няма і знаку ад былога прыгожага пісьменства і ўвогуле беларусу і беларушчыны. Апошнім часам стала ўжо агульным месцам сьцьверджаньне, што да забойства культуры прыклаў руку сам майстра – мастак, інтэлігент і інтэлектуал. Вучоны, дыпламаваны дурань, адначасова поўны невук. Просты чалавек не зьмікіціў ці не дапетрыў бы да такога. А майстра, які непасрэдна сам з культуры, вынайшаў ці адшукаў табакерку і выпусьціў з той табакеркі чорта. Бо загадзя ведаў, дзе сядзіць чорт і што яму асабіста ад чорта патрэбна. І хаця той чорт яшчэ падшыванец, недаростак, як і ўсе яны, бяз роду і племені зачатыя ў савецкіх табакерках, аказаўся надзвычай амбіцыйным і агрэсіўным. Пачаў з вынішчэньня тых, хто яго стварыў, хто выпусьціў яго на волю.

Для мяне асабіста – гэта ў нечым я сам. Я сам часоў майго фабзайніцтва і пэтэвушніцтва. Вернемся жа ў той час. Хаця... Чаго вяртацца. Я даўно ўжо там. Адкінуты туды, у маленства, дэмакратыяй і незалежнасьцю. Адкінуты фізічна, маральна і матэрыяльна. Напрыканцы дваццатага стагоддзя і на пачатку дваццаць першага. Вось такія выкрутасы часу.

Гавораць, што час мае ўласьцівасьць сьціскацца і разрэджвацца. І ў паўзах паміж тым і гэтым чалавек здольны апынуцца ні то ў сваім мінулым, ні то ў будучым. Ня ведаю, сьціснуўся ці расьціснуўся мой час, толькі я апынуўся ў яго няпэўнай паўзе. Трапіў у адну з паўз і завіс у ёй. Завіс, здаецца, ужо назаўсёды. Вярнуўся да таго, з чаго некалі пачынаў, і ня думаю, што паўза, мінулае выпусьціць мяне ў наканаванае мне будучае. Ды я ўжо сам ня надта імкнуся да яго. Усе сілы патрачаны на выжываньне, тую ж самую готыку, пра якую гаварыў тут вышэй – пераадоленьне прывабнасьці страху. Бо жадаю застацца чалавекам і беларусам нават у маім старэчым нечакана абрынутым на мяне пэтэвушніцтве.

І нічога, нічога, не бяды. Жыцьцё, як у тым анекдоце, які я вам распавёў таксама крыху вышэй, наладжваецца. Пенсію даюць рэгулярна ў час, каровы яшчэ дояцца, зямля родзіць. Так што кефіра, малака і хлеба ўдосталь. І сонца, хоць і зрэдку, яшчэ заглядвае ў маё вакенца. Жыцьцё наладжваецца і працягваецца, як гэта і мае быць.

Але бліжэй, як гаворыцца, да нашага дзявочага, да сярэдзіны другой паловы мінулага стагоддзя. Я, як і сёньня, у першы раз яшчэ пэтэвушнік. Малады, здаровы і дужы. Крыху галодны і прыблатнёны, а больш, як гаварылі ў той час, нахабны, наракаючы на ўсё і ўсіх, хто мне чымсьці не дагадзіў, нечага не дадаў і ў нечым абышоў. Пэтэвушнік, які з усёй сусьветнай культуры, з усяго прыгожага пісьменства засвоіў толькі ад раньняга Антона Чэхантэ тое, што карась любіць, каб яго смажылі ў сьмятане. Засвоіў і хіхікае, не трымаючы ў галаве, што той карась і ёсьць ён сам – аматар распаленай патэльні. І такіх карасёў у нас сёньня разьвялося вагоны і маленькія вазкі. У мяне ўражаньне, што ўвогуле нашая культура, наш інтэлект спыніліся на пэтэвушна-карасінай стадыі. На лоўлі гэтых абяздоленых карасікаў і смажаньні іх у сьмятане дзеля, зразумела ж, шчасьця і дабрабыту апошніх. Толькі пры гэтым пэтэвушнік больш ужо не хіхікае, бо, як гавораць на Беларусі, сьвіньні не да парасят, калі яе смаляць.

Страчана, некуды зьнікла пачуцьцё гумару, як зьнікла разам з ім, на маю зноў жа пэтэвушную думку, у эвалюцыіі сёньняшняга чалавека – чалавека часоў дэмакратыі, суверэнітэту і стабільнасьці – адно маленькае зьвяно, парваўся ланцужок. Як некалі парваўся і зьнік паміж малпай і хомасапіенсам. Зьнік, а потым усё ж знайшоўся. Калі загадалі знайсьці і пачалі ствараць новую супольнасьць: савецкі чалавек – партыя – КДБ – стукач – зэк. І наадварот: зэк – стукач – КДБ – партыя.

Не хапае сярэдзіны, стрыжню і ў ланцугу лялькавод – алігарх – кідала. І я амаль упэўнены, пра гэта яскрава сьведчыць сёньняшняе ўладнае мысьленьне і веданьне айчыннай гісторыі і культуры, былыя пэтэвушнікі як носьбіты і правапераемнікі новай постсавецкай супольнасьці якраз і зьяўляюцца тым самым зьвяном, якое, нам здаецца, выпала з агульнага ланцуга і згубілася. Ніколі і нікуды ў нашай краіне яно не выпадала і не гублялася.

Памятаеце ж: Уладзімір нарадзіў Іосіфа, Іосіф – Лаўрэнція. Вось так і тут камуністычнае насеньне прарасло, узышло і ўзбуяла кідаламі, качкамі, алігархамі – творцамі найноўшай сёньня ў сьвеце культуры. Культуры, якой яны адразу ж і выракліся, бо для іх жыцьцядзейнасьці хапала інтэлекту звычайнага пэтэвушніка. І пэтэвушнік па духу, маральнасьці і адукацыі стаў спадкаемцам і праваднікОм зноў адроджаных у нашай краіне ідэй марксізму-ленінізму. Гэткі сваеасаблівы ці то холдынг ці то кастынг на зруйнаваных палетках былой айчыннай і сусьветнай культуры. Пэтэвэшнік дыктуе і правіць сёньня баль.

Адчуваю, што колішнія ды і сёньняшнія пэтэвэшнікі могуць на мяне і пакрыўдзіцца. Але ў сваё апраўданьне паўтаруся: я сам з іх – адвечны патомны пэтэвэшнік. Зноў жа паўтаруся, як і ўсе мы на Беларусі. Уся вялікая краіна, імперыя СССР напрыканцы саракавых амаль на два дзесяцігоддзі была падпяразана шырокім пэтэвушніцкім рамянём. Уся магутнасьць імперыі, як з гогалеўскага шынялю, выйшла і набрала моцы з фабзайніцкага бушлату і шынелькі пэтэвушніка, іх суконных штаноў і сацінавых гімнасьцёрак. Я закаханы ў пэтэвушніка, так званыя працоўныя рэзервы. Гэта таксама была імперыя, калі хочаце, зорны, касьмічны падмурак краіны Саветаў. Тут няма перабольшваньня. Згадайце толькі

Юрыя Гагарына, яго пачатак да зорнага шляху, ці Валянціну Церашкову – фабрычную дзяўчыну. Нашу зямлячку – першую жанчыну ў космасе.

Увогуле, зьдзіўляюся, чаму ніхто не дасьледаваў шлях да зорак савецкіх касманаўтаў. На маю думку, гэта было б вельмі цікавае і паказальнае дасьледаваньне. Па-першае, даволі значны ўзносак у касмагісторыю беларусаў: Церашкова, Кавалёнак, Клімук... Па-другое, чаму так атрымалася, што першымі касмапраходцамі былі людзі простага паходжаньня, а ў беларускім варыянце – дык і зусім бязбацькавічы? У той час як прафесія гэтая была элітная. Ці не таму так здарылася, што да пачатку засваеньня космасу эліта, партыйная эліта, ужо вырадзілася. Дэградавала на добрыя справы. Нашчадкі яе былі больш прыдатныя да фарцоўкі, спекуляцыіі брыльянтамі, алкагалізму і нават суценёрства: сафары ў Афрыцы, наладжваньня вясельля ў былых царскіх раманаўскіх палацах.... Яны згубілі, змарнавалі ў баляваньнях, распусьце і раскошы стваральную сілу бацькоў, эпохі. Мо таму і ляпнулася вялікая імперыя, спужалася і захінулася ад прыліву маладой пэтэвушнай плыні крыві.

І гэтая хваля сьвежай стваральнай крыві патаемна, нябачна, на маю думку, зноў набірае вышыню. Пэтэвушнікі сёньня завуцца каляжанамі і каляжанкамі. І ў нашыя дні стаць навучэнцам коледжу, у якім даюць прафесію, ня надта проста. Пры паступленьні ў іх ужо ёсьць конкурс, як ва ўніверсітэт, а часам і большы. Маладое пакаленьне, якое мо і падсьвядома зразумела і адчула час, выбірае прафесію і працу і не імкнецца да палітыкі, прафесійных балбатуноў, што ў хваравітых хвалях гаворкі пра ўсё на сьвеце, прыроджанай панаднасьці да пераліваньня з пустога ў парожняе забываюцца нават, пра што гаварылі ўчора, што гавораць сёньня. А ўсё таму, што ў іх няма свайго слова – толькі гукі. Гукі, і нічога больш – ні адзінага свайго, спадчыннага, радаводнага слоўца – гіпноз з заёмнай, запазычанай з чужой, скалечанай сваім маўленьнем пустаты і хлусьні ў разьліку на пагалоўнае бяспамяцтва. А карацей кажучы, калгасна-калектыўная прамыўка мазгоў па апрабаванаму ўжо метаду Кашпяроўскага з Чумаком і Чубайсам. Узор таго, як дэградавала былая савецкая ідэалогія і прапаганда, і рыхцікі сабрала са шклоўскага выкапневага хлопчыка, якога мы ўсе добра ведаем з падручнікаў нашай гісторыі.

Хлопчыка, мо ў свой пячорны час таксама пэтэвушніка, бо надта ж ён пагрозьлівы і, па ўсім, адукаваны. Гісторыя ж, як сьцьвярджаюць дасьведчаныя людзі, любіць сваімі фарсамі і трагедыямі рухацца па сьпіралі, і ў гэтым сваім сьпіральным руху так стапталася і выдыхлася, што няздольная ўжо на нешта стваральна-новае. Добра. Калі пэтэвушнікі ідуць у эліту: касманаўты, генералы і міністры. І вялікае гора ўсім, калі міністры вяртаюцца да сваёй існасьці: пераўтвараюцца ў пэтэвушнікаў. Як былі, так і застаюцца на пасадзе міністраў пэтэвушнікамі. А ў нас гэта спрэс і паўсюдна...

Тут я павінен прызнацца, каб вы мяне не абвінавацілі ў плагіяце ці ў палітнекарэктнасьці, што мае высновы пра пэтэвушніка крыху запазычаныя. Ня я гэта прыдумаў. Так было моўлена пра адну модную, наскрозь бестсэлерную пісьменьніцу маскоўска-рублёўскага разьліву – пушнога і брыльянтавага запаведніку расійскіх алігархаў Аксану Робскі, пра якую з-за невыразнасьці і бляклясьці пісьма, адсутнасьці думкі, чаго-небудзь

вартага ўвагі ў душы і галаве коратка мовілі: “внезапно разбогатевшая пэтэушница”.

Так можна пазначыць з невялікім выняткам і ўсю сучасную літаратуру, пачынаючы ад штодзённых бюджэтных дзяржаўных газет да кніжак дзяцей капітана Гранта, якія выдаюцца толькі па Ягоных асабістых грантах і скіраваныя на абслугу існуючай будзённасьці, дачасьнікаў. Дзеля нашай краіны мо гэта і не зусім тыпова, бо для пэўнай часткі грамадзянаў не існуе і самой краіны. Таму што яна здань, прывід (ці не таго камунізму, што ўжо некалькі стагоддзяў блукае па Еўропе, сьвеце). Ёсьць насельніцтва, але няма народу, чуецца крык, але няма слова. Захаваліся незьлічоныя скарбы культуры, але няма самой культуры, самога карыстальніка гэтай культуры. Відавочная толькі мара аб інакшым жыцьці і долі, адметны, сваеасаблівы, мо і падсьвядомы, беларускі пратэст супраць абражанасьці свёй і чужой пагарды беларусам, непрызнаньня яго права звацца чалавекам і народам. Бо народу ня можа быць без культуры. Гэта толькі прывід народу, расьлінная яго здань на раянаванай ім тэрыторыі пражыцьця. Культура – хлеб народу. Хлеб стагоддзяў і на стагоддзі. У нас жа ён ня толькі з асьцюкамі і мякінай, але і з палыном-чарнабылам – вельмі горкі. Таму няспынна і судзяцца творцы з дзяржавай. Дзяржава судзіць творцаў.

Ці было яшчэ ў якой-небудзь краіне ў якія-небудзь часы, калі б творчая эліта амаль цалкам ішла ў апазіцыю, як цалкам пайшоў у яе Саюз пісьменьнікаў Беларусі? І якія імёны, якія постаці. Сама культура пайшла ў апазіцыю да ўлады. А што ўлада? Калі губляеш тое, пра што ня ведаеш, то і не баліць галава аб страчаным, нішто яе ня тлуміць: “Пустое сердце бьётся ровно”.

Улада жыве сваімі ўяўленьнямі пра культуру. Але ці можна лічыць інтэлектуальным набыткам і культурай тое, што па сутнасьці сваёй зьяўляецца абслугай – службовым ведамствам улады. Яе хісткім ценем і падтанцоўкай, што, ня маючы іскры Божай, спажывае імёны вялікіх нашых нябожчыкаў, маніпулюе імі і прыстасоўвае да сваіх патрэбаў. Па сутнасьці – некрафільствам. Бо жыць усё ж трэба, трэба існаваць і зарабляць на хлеб надзённы. А самым лоўкім – карыстацца момантам няўчасься – рабіць кар’еру. І гэта ня так бяскрыўдна, як здаецца на першы погляд. Мёртвыя з таго сьвету ўсё ж агрызаюцца – помсьцяць жывым. І мо менавіта таму так памяркоўна, прасьветлена і чыста беларус адыходзіць на той сьвет – з-за чысьціні сваіх мараў і мрояў, выпакутаванасьці іх у стагоддзях і стагоддзях, ад Прыпяці, Дняпру, Нёману і Бярэзіны, Кірылы Тураўскага, Еўфрасіньні Полацкай, Францішка Скарыны і да нашых дзён?

Адсюль, ад магілы, прабачце мне, ад услаўленьня і слыннасьці паміраньня, ад белых яе адзеньняў і пасьмяротная нашая слава. Дарэчы, слава таго ж Уладзіміра Караткевіча. Апошні сумны ідальга, Дон-Кіхот нашай зьнявечанай Айчыны стварыў яе зусім не такой, якой яна была на самой справе, а якой ён хацеў, праг яе мець і бачыць. Якой прагне яе бачыць пакрыўджаны, абойдзены Богам, лёсам і жыцьцём кожны беларус у тых жа бел-чырвона-белых апратках, пад белымі крыламі Боскай птушкі. Такой Караткевіч і ствараў сабе сваю краіну, дзе зайцы нам вараць піва, а Дон-Кіхоты змагаюцца з усім сьветам за гонар сваіх Дульсінеяў. І таму ўсе разам мы сказалі: гэта і ёсьць нашая бацькаўшчына, гэта і ёсьць мы. І ўяўныя

мы больш сапраўдныя, чымсьці на самой справе. Магутны самападман словам і духам вялікага беларуса, не з сыноў капітана Гранта і карытнага “холдынгу”.

І я часам думаю: а мо мы сапраўды такія, мо сапраўды дух нашай краіны, сутнасьць яго такая. Такой яе, прарадзіму сваю мілую, праўда, з таго ўжо сьвету, бачаць нашыя бацькі і дзяды. І я таксама як ужо там, імкнуся глядзець на жыцьцё іхнімі вачыма. І таму так абураюся, калі на старонках прагрэсіўных выданьняў чытаю пра сябе і сваіх суайчыннікаў: рабы, плябеі. Ці ўсьведамляюць, ці разумеюць яны, што ў сваёй хаце гадзіць на стол, на галаву сваім жа бацькам непрыстойна? Такое ні на тым, ні на гэтым сьвеце не даруецца, хаця і выбітным змагарам і мысьлярам. Што б там ні гаварылі, няхай і тагасьветна, а Беларусь ёсьць, існуе. Жыве Беларусь і будзе жыць. Усё мінецца, а праўда застанецца, нягледзячы на зьдзек, пагарду і абразу. З нічога ж нічога і не бывае, апроч нашай афіцыйнай мілагучнай статыстыкі, зноў жа амаль тагасьветнай, ці не з пятлёй ужо на шыі, з-пад шыбеніцы.

І таму наш свойскі, пэтэвушны бруд, хатні смурод і гной у адсутным рэчышчы айчыннай культуры здаецца не такім пахкім і брыдкім. Смуродзяць, не адчуваючы каральнага мяча, што толькі на павуцінцы вытрымліваецца бягучым днём над іх галавой. Хоць і вельмі паныла, бесталанна, зноў жа пэтэвушна, але смуродзяць. І айчынны сьмерд і смурод зьліваецца і зьмешваецца са смуродам і сьмердам па-за межамі – з боку так званага СНД. Атрымліваецца сапраўды выбуховая сумесь накшталт кактэйлю Молатава.

Некалі з трыбуны дзяржаўнай расійскай думы дэпутат-кінарэжысёр Station Станіслаў Гаварухін, пэўна ж, цытуючы нейкага іншага, прапанаваў зашыць чалавеку адно сумнавядомае месца з-за яго непрыхаванай сьмярдзючасьці. Мо і варта было б зашыць. Толькі вынік гэтага, думаю, зразумелы кожнаму. І ўвогуле, гэта нагадвае камсамольскае брыгадмілаўскае змаганьне са стылягамі. Толькі паспрабуй зашыць, і па вуліцы ня пройдзеш. І не вядома яшчэ, хто ад тых зашытых народзіцца, якая брыдота, пачвара. Бо гэта ўсё ж не што іншае, як самая звычайная плазма, біямаса – вытворчае ад масавай культуры, культуры раптоўна атрымаўшых уладу вечных падтанцоўшчыкаў і раптоўна забагацелых пэтэвушнікаў.

Плазма і біямаса, скіраваная на ўласнае размнажэньне і забясьпечанае мяккае ў ня вельмі спрыяльным беларускім клімаце вечнае стойлавае ўтрыманьне. Толькі ўлада дае ім магчымасьць разьдзьмуць ноздры да такіх памераў, за якім губляецца вартаснасьць твару, твар ужо непатрэбны. І гэта вельмі стасуецца да псіхалогіі пасталелага, не сапсаванага, не кранутага інтэлектам і цывілізацыяй, маючага свой адмысловы цнатлівы розум пэтэвушніка: самага хітрага на сьвеце, праніклівага і мудрага.

Як гэта ні прыкра сёньня, я ў свой час быў таксама біямасай і плазмай, палівам-гавядой шчасьлівай будучыні чалавецтва. Біялагічна актыўным дадаткам паўсюдна ўжо адмёрлай, а ў нашай краіне зноўку адроджанай ідэалогіі, дадаткам, спрыяльным жывёле, да жывёльнага стану нізводзячага і чалавека, які нават яшчэ не нарадзіўся. І такімі ненароджанымі, але ўжо эмбрыянальна сапсаванымі ў свой час была большасьць з нас, у тым ліку і творцаў.

Варта толькі ўзгадаць “Дарогу №1” – так называлася кніжка нашага ж

брата-пісьменьніка, публіцыста. Кніга неверагодных памераў і такой жа неверагоднай якасьці паперы, замежнай, са шматкаляровымі фотаздымкамі, зноў жа нязвыклай нам неверагоднай якасьцю друку. Па сьведчаньні аўтара, сабекошт яе таксама быў па-за нашым розумам: кожны асобнік – легкавік “Жыгуль”. І выдавалі яе звыштэрмінова. Галоўны выдавец рэспублікі запрасіў на яе выданьне год. У ЦК кампартыі Беларусі яму сказалі: месяц, ад сілы – два. “Гэта немагчыма!” – ускрыкнуў выдавец. – “Ну што ж, – мовіў яму ў адказ сакратар ЦК. – Нам давядзецца пашукаць іншага выдаўца”. І стары выдавец паправіўся, загаварыў амаль словамі Я.К.Лігачова, сакратара ЦК КПСС: “Невозможно, но чертовски хочется поработать”.

Кнігу выдалі за паўтары месяцы, бо “Дарога №1” вяла праменька ў камунізм. І трэба мець мужнасьць прызнацца, што ў нейкай ступені тую дарогу стварылі мы, пісьменьніцкая і журналісцкая гвардыя, падручныя партыі. Варта толькі ўзгадаць кавалькады бліскучых чорных “Волгаў” і каляровых “Ікарусаў” на той дарозе з сакратарамі партыі і начыньнем плазмы – з памагатых, рупліўцаў перадавога атраду партыі: нашыя мэты былі правільныя, і дарога правільная — у камунізм, які пачаўся ўжо, расквітнеў, як не круці, зноў жа на зьнішчанай меліяраванай зямлі, спляжаных балотах, спрамленых і асушаных рэках, азёрах і ручаях, на ладзе і гісторыі палешука, ужо сканалага: скончыў жыцьцё самагубствам. І тое самагубства мы павінны былі ўслаўляць і ўслаўлялі. Шматпавярховыя камяніцы аграгарадкоў, што як з таго сьвету паўсталі замест адвечных вёсак і сёл (дарэчы, усё гэта адраджаецца зноў, усё зноў вяртаецца на кругі своя, вяртаецца, як адкрыцьцё, новамесіянства).

З асаблівым замілаваньнем спыніліся і ўглядаліся ў сянажныя вежы. Нястомна параўноўвалі іх з касьмічнымі караблямі. Хаця выдатна ведалі, што ў тых вежах звычайны і даволі сьмярдзючы сілас. Біямаса і плазма для гадоўлі жывёлы.

Але ж, як бы там не было, што б пра гэта не гаварылі, што б не гаварылі пра нас, да гэтых вежаў нас вяла адвечная пракаветная мара нашых бацькоў бачыць сваіх дзяцей сытымі, заможнымі і дагледжанымі. О, гэтая беларуская мара ў дадатак да сьляпой і глухой руплівасьці і дбайнасьці. Колькі пакаленьняў яна згубіла! Вось на што трэба наракаць, а не галасіць: рабы, плябеі. Хай так яно і ёсьць. Але ж гэтыя рабы і плябеі не жабракамі пусьцілі нас у сьвет. І ці ня больш яны нагадваюць сёньня са сваімі ацалелымі казкамі, паданьнямі, песьнямі і танцамі, сваімі замшэлымі ўяўленьнямі жыцьця — справядлівасьці, сумленьня, сораму і гонару, вартасьці і годнасьці, нейкім цудам нязжытых на зямлі рыцараў сумнага вобразу. Дзіды і пікі якіх разам з мячамі нутранога і натурнага нашага сярэднявечча саржавелі, млыны спрахлі і рассыпаліся пад націскам чужых агрэсіўных ветраў пакручастага часу эпох. Латы сатлелі, а коніка свайго яны неўпрыкмет зьелі, ашчасьліўленыя пагалоўнай калектывізацыяй, а потым дэмакратызацыяй, а потым, а потым – зноў капіталізацыяй.

І ці не такая прыкрая рэальнасьць, што ня ведае і не прызнае літасьці, і была жыцьцём, калі тое жыцьцё мела яшчэ твар неагульнага выразу. Калі чалавек верыў яшчэ свайму твару і імкнуўся яго захаваць. І як некалі праз тыя ж млыны сярэднявечча і апантаных змагароў з імі праз сянажныя вежы ўжо нашага часу, жывёлагадоўчыя фермы, што часьцей былі лепш

дагледжанымі, чымсьці жыльлё чалавека, пралягала, як ні супраціўляйся і не аспрэчвай гэтага, культура? Сацыялістычная савецкая культура, ад якой неаддзеленымі былі і мы. Зьяўляліся, нягледзячы на ўсё, непадзельнай часткай культуры сусьветнай. Сьвет ня вельмі вітаў сацыялізм, хоць, сьцяўшы зубы, усё ж прызнаў, але ён ніколі не адмаўляў таленту і энэргіі яго духу.

Разумею, што ўхваляць, захлынацца ад замілаванасьці сваім мінулым, дарэчы, як і ганіць, выракацца яго — грэх, зьява хоць і процілеглая манкурцтву, але ж гэтай процілегласьцю цалкам і супадаючая з ім. Гэткі сваеасаблівы падман закамплексаванай хваравітай памяці, тупіковасьць яе самастойнага існаваньня. У пацьверджаньне гэтага мне згадваецца цікавы і знамянальны выпадак, што адбыўся на “дарозе №1”. На чале з сакратаром ЦК кампартыі Беларусі па ідэалогіі мы наведалі паказальную жывёлагадоўчую ферму на Брэстчыне. І на той ферме сакратару ЦК, ідучы між стойламі жывёлы, трэба было ж спаткнуцца. Ды так, што міжволі зазірнуў быку-вытворцу пад хвост. І ўсё кіраўніцтва на тым месцы крышачку спатыкнулася. І ўжо не міжволі, а вельмі пільна прыглядзелася да незашытай у быка дзіркі пад хвастом. Ледзь насы туды не ўваткнулі. Бык з гожасьцю ўспрыняў цікаўнасьць начальства да ягонай ср...кі, нават прыпыніў на хвіліну-другую сваю смуродную справу, і толькі шматлікасьць начальства ў белых халатах і прадызенкаваных пантоплях вымусіла яго працягнуць яе.

Выпадак сам па сабе і сьмешны, і прыкры. Але ці толькі сьмешны і прыкры? Ці ня ўсе мы з той пары набраліся імпэту заглядваць сьледам за начальствам быку пад хвост? Заглядваць з замілаваньнем і знакавым выглядам на твары – далучанасьці да нечага вельмі высокага, амаль сьвятога. Асабліва гожа прарабляюць гэта сёньня саноўнікі найвышэйшага рангу, губляючы прыстойнасьць і твар, стоячы па струнцы пасярод мішурна-сусальнага золата ўладнага кабінету. Не, зусім ня будучае пачынаецца ў тых кабінетах. Так адраджаецца і гоніцца за намі мінулае.

І ўсё ж пры ўсім гэтым, пры ўсіх хібах, заганах, памылковасьці мінулага – у ім няма віны. Вінаватыя заўжды мы. Асабліва вінаватыя сёньня, у імгненьні, у якім адсутнічаюць і мінулае, і ўжо бягучае, якое ж мы самі спаскудзілі. Паскудзіш сябе, а ківаеш на нябожчыкаў.

У адрозьненьне ад пануючых сёньня пэтэвушных літаратуры, культуры і інтэлекту наш цалкам памылковы час, эпоха, закрыжаваная незьлічонымі магіламі, могілкамі нашых бацькоў, мела свой адметны, выразны твар, з адбіткам думкі пра будучае, пра сваіх нашчадкаў, дзяцей. Твар жа сучаснай культуры, мастацтва размыты, раствораны ў распанелай сёньня так званай мас- і попкультуры, што пачынаецца не ад лоба, а ад лабка. І гэта пэтэвушналабковая культура, а яна ўласьціва ня толькі мастацтву, добра прыдатная і эканоміцы – усяму, з чаго складаецца бягучы дзень, паглынула ўсё больш-менш сапраўднае і прыстойнае. Таму ж паўсюдна з усіх сродкаў масавай інфармацыі, газет, радыё, тэлебачаньня зьнік ня толькі творца, але і вытворца, чалавек працы, чалавек, што жыве з мазаля. Не яго, не яго час.

Найноўшая, пануючая біямаса ня мае твару. Зусім ня мае, нібыта ў безаблічнасьці хоча схавацца ад будучыні, ад непазьбежнай кары. Як некалі з болем выгукваў Ясенін: «Я хочу видеть этого человека!», сёньня можна

кілу надарваць – твару гэтага чорнага чалавека вы не ўбачыце. Бо гэта мо і ня твар. А нешта зусім іншае, толькі зашытае, а мо і наадварот, процілеглае яму. І гэта процілеглае наадварот абагуленае, сярэднестатыстычнае мо і сапраўды зьяўляецца тварам нашага часу, эпохі. А стандартызаванасьць, агульнасьць яго выразу тлумачыцца адвечнай сарамлівасьцю выстаўляць напаказ што-небудзь, хоць і сваё, але непагляднае. Таму ж гэткая роўнасьць інтэлекту амаль што ўсёй нашай эпохі, у якой перамог ня проста былы качок-кідала-лялькавод, але і лялечна плакатны, у савецкія часы прыняты за ўзорны абагулены твар камсамольскага правадыра.

І ў ім мяне засмучае ня толькі адсутнасьць думкі, болю і трывогі, непасрэднасьці. Але і выстаўленая напаказ упэўненасьць у правільнасьці яго. Правільнасьці ўчынкаў, правільнасьці яго чыну, паводзінаў і мысьленьня. І за гэтую прыязнасьць да вярхоўнай правільнасьці, сытнасьць думкі, дабрабыт існаваньня, па ўсім, хутка, а мо і вельмі хутка мы будзем жорстка разьлічвацца. Разьлічвацца за тое, што мы сёньня ніякія. Ва ўсім падобныя адзін да аднаго.

Сярэднія. І гэта ўжо вынік страты нашай душы, страты свайго, спадчыннага. Нашага мо ўжо нават канчатковага краху. Краху непрыкметнага, а парой дык нават і вясёлага, але часьцей – зьдзеклівага разьвітаньня з культурай. І ня толькі нашай – сусьветнай, бо, страціўшы сваё, на чужым не забагацееш, ні волі, ні розуму не прыдбаеш.

Мы страцілі само жаданьне жыць. Жыць сваім розумам, наперад, як некалі жылі нашыя продкі і часткова мы самі. Згадваю сябе малога. Мне дзесяць-дванаццаць гадоў. Чытаю нейкі вельмі сацрэалістычны твор, у якім гаворыцца: чалавек наведае Марс на самым пачатку другога тысячагоддзя, бо адлегласьць у гэты час паміж Зямлёй і Марсам будзе найменшай. Прыкідваю: двухтысячны год? Дажыву! Варта, край як неабходна дажыць. І пачаў жыць. Бо па-нада мной быў космас. Космас быў над Беларусьсю. Вось такой неабходнасьці жыцьця, касьмічнага жыцьця наперад ні ў кога з тых, хто побач, няма. І гэта мо самае страшнае — адсутнасьць над намі неба, нябёсаў, як сёньня гавораць, сьвятла ў канцы тунэлю, сьвятла на дарозе нам і нашаму коніку, калі мы будзем выбірацца з кірмашу. Ды і пра сам гэты кірмаш мы ня надта багата ведаем. Таму што жывем больш інстынктыўна, інтуітыўна.

Апошняе, забойства сьвядомага жыцьця, мне здаецца знакавым для нашага часу, знакавым для нашага мастацтва, культуры і стану сёньняшняга нашага інтэлекту. Нас спасьцігла намі ж, мастацтвам, створаная фантасмагарычнасьць, скруціла галаву, рукі, пазбаўленая дзяржаўнасьці і той жа неінтуітыўнай думкі пра жыцьцё крыху наперад. Таму мы так нараскіраку спыніліся перад будучыняй, што праблiснула было ўжо. Спыніліся, бо так нараскіраку перад сумнай рэальнасьцю і бліскучасьцю камунізму і жылі. На раскіраку паміж дзьвюма магіламі, парослай травой забыцьця – бацькоў – і сьвежай, яшчэ не ўтрамбаванай, з непавялымі жывымі кветкамі – дзяцей, прымерваючыся паміж гэтымі магіламі ўладкавацца і самім, баючыся толькі наскочыць на чэрап беднага Ёрыка. А на нашай беларускай зямлі гэтых Ёрыкаў незьлічона. Сёньня і гэтай боязі ўжо амаль няма. Бо такімі чарапамі продкаў скрозь засеяна нашая зямля. Чарапамі бедных Ёрыкаў усіх часоў нашай крывавай гісторыі. У тым ліку і часоў росквіту готыкі, калі ўпершыню

сьвет дазнаўся пра беднага Ёрыка, ня ведаючы і нават ня згадваючы пра яго паходжаньне. Ня ведаючы, што ён, жывы ці мёртвы, прагне далучыцца да людзей сьвету. Але сьвет трушчыць і трушчыць іх чарапы. І чарапамі тымі вымашчана ўся іх дарога. А яны ўсё ідуць і ідуць, мёртвыя і жывыя, скалечаныя – бязногія, сьляпыя і нямыя. Ідуць, пачуўшы і спазнаўшы прывабнасьць страху, хваля за хваляй, стагоддзе за стагоддзем. Ідуць, ужо забыўшыся на дарогу, куды яна вядзе і чаму ім трэба ісьці. Хто, што і куды іх гоніць, бедных беларускіх Ёрыкаў, на які – той ці гэты сьвет?

І вось зараз гэтыя бедныя Ёрыкі, невядома, жывыя ці мёртвыя, на хвілінку спыніліся, каб перавесьці дыханьне і дасьведчыцца: а ці ж сапраўды яны жывыя, ці ўжо няма чаго і тузацца, варушыцца, здабываць нейкую пэўнасьць і прыбіцца да чаго-небудзь аднаго. Яны як заўсёды спазьніліся. Спазьніліся на свае ж хрэсьбіны і хаўтуры. Ня выкарасталі адзіны шанец, дараваны ім гісторыяй, даказаўшы яшчэ раз, што яны хоць і народ з багатай гісторыяй, але на сёньняшні час – пазагістарычны. Паверылі невукам, качкам, кідалам. Самі ж зладзілі сабе ярмо і па сваёй ахвоце ўсклалі яго на шыю. Падпарадкаваліся, прынялі і прызналі дыктат над сабой, дыктат быцьця толькі зьверху. За што і расплочваюцца.

Як усё, што ўзрастае з местачковай, калгасна-саўгаснай субкультуры, завяршэньне нашай готыкі монстрава вычварнае. Інакш, пэўна, і ня можа быць: «Сон разума порождает чудовищ». Гэты пракаветны наш сон розуму нараджае толькі монстрыка — прывабнасьць страху. Нараджэньне ж самога монстра наперадзе. Калі готыка пазбаўляецца якой бы то ні было культуры, пазбаўляецца сваёй прываблівай абалонкі, авечай скуры і выходзіць са сферы стылю і архітэктуры, прэтэнзіяў на нешта духоўнае і цалкам пераходзіць ў зусім іншую сферу. Сферу псіхапаталогіі і судзебнай медыцыны. У так званы ў псіхіятрыі Стакгольмскі сіндром. Гэта калі ахвяра і кат зрастаюцца паміж сабой. Калі кат з-за пастаяннага кантакту і псіхалагічнага ўзьдзеяньня на ахвяру замбіруе яе, пачынае выклікаць у апошняй сваеасаблівую сімпатыю і разуменьне, любасьць і замілаваньне. Упадае ў так званы шокавы стан, стан зомбі, які можа доўжыцца галамі, а часам і пажыцьцёва. Вось такія метамарфозы нашай айчыннай готыкі.

Расплочваемся ўсе мы за тое, што не пазналі сябе на дарозе ў будучыню. Сустрэліся на сваёй пракаветнай Галгофе нашыя бацькі, няскораныя нябожчыкі, і мы, жывыя, стомленыя толькі сваімі ж вялікімі перамогамі. Сустрэліся і моўчкі разышліся, разьмінуліся. Бо адны ня ведалі слова на гэты сьвет, другім наогул заклала горла, бо яны даўно ўжо забыліся на родную мову. Але мёртвыя, ня ведаючы слова на гэты сьвет, усё ж адмовілі дыктату чужой волі над сабой, аддалі перавагу зямлі і моўчкі леглі зноў у зямлю, свае магілы, а жывыя, не багаслаўлёныя шчасьцем і радасьцю вольнай сьмерці, моўчкі сталі ў чаргу па ярмо, пачуўшы са скамянелай сваёй юдолі і Галгофы нахабны і пагрозьлівы крык: “Няма і ня будзе вам дарогі ў цывілізаваны сьвет, Ёрыкі. Пустыя вашыя вачніцы. Чарапы вачэй ня маюць”.